Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Гістарычны факультэт

Рэг. № УМ(К)-26-1-20/2019

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____________ А.Ф.Вялікі
27 06 2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_____________ А.В.Касовіч
27 06 2019 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасцей:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік: А.Ф. Рацько, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета БДПУ 27 чэрвеня 2019 г. пратакол № 10

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Гістарычны факультэт

Рэг. № ______________________

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ___________________ А.Ф.Вялікі | ___________________ А.В.Касовіч |
| ___ _______ 2019 г. | ___ _______ 2019 г. |

.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ**

для спецыяльнасцей:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік: А.Ф. Рацько, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета БДПУ 27 чэрвеня 2019 г. пратакол № 10

**ЗМЕСТ:**

**ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА** 3

**1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ**
1.1. Канспект лекцый 5

**2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ**
2.1. Планы семінарских заняткаў 60
2.2. Заданні па кіруемай самастойнай рабоце студэнтаў 68

**3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ**
3.1. Крытэрыі ацэнкі адукацыйных вынікаў студэнтаў 80
3.2. Матэрыялы цякучай і выніковай атэстацыі (прыклад тэставых заданняў) 82
3.3. Пытанні да падрыхтоўкі да экзамену 87
3.4. Тэматыка рэфератаў 89

**4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ**
4.1. Вучэбная прагарама па вучэбнай дысцыпліне 91
4.2. Пералік рэкамендуемых навучальных выданняў і інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы 117
4.3.Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне 119
4.4. Метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы рэферата 124
4.5. Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі 125

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс "Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі" прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў рамках модуляў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін па выбару студэнта. Ён скіраваны на авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі дасягненнямі гістарычнай навукі, апрацоўку, асэнсаванне і сістэматызацыю вучэбнай інфармацыі, набыццё практыкаарыентаваных уменняў. Асаблівасцямі дадзенага вучэбна-метадычнага комплекса з'яўляюцца ўдасканаленне зместу дысцыпліны, забяспечэнне фундаментальных ведаў аб грамадскім жыцці беларускага народа на працягу гістарычнага развіцця, а таксама павялічэнне ролі і ўдзельнай вагі самастойнай работы студэнтаў, выкарыстанне прафесійнага, кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, магчымасць выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій. Паглыбленыя гістарычныя веды дапамогуць развіць і замацаваць у студэнцкай моладзі ідэю ўзвышэння асобы ў грамадстве, прызнання чалавека вышэйшай каштоўнасцю грамадскага жыцця, сфарміраваць сучасны светапогляд.

Грамадска-палітычная думка Беларусі – гэта адносіны розных груп людзей, пэўных асоб да падзей і фактаў сацыяльнага жыцця, стан масавай свядомасці, які адлюстроўвае погляды грамадства або яго часткі на з'явы і працэсы сацыяльна-палітычнай і сацыяльна-культурнай рэчаіснасці, дзейнасць пэўных асоб, груповак, арганізацый. Можа выступаць у ацэначных, аналітычных і іншых меркаваннях.

Грамадска-палітычная думка Беларусі фарміравалася на працягу стагоддзяў. У аснове любога палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага факта закладзена тая ці іншая ідэя, якая доўга блукала ў асобных галовах, дабіваючыся агульнага прызнання, і стала кіраўніком палітыкі, заканадаўства, грамадскай дзейнасці. Яна рэгулявала паводзіны асоб, розных груп, суполак, сацыяльных інстытутаў у грамадстве, выпрацоўвала пэўныя нормы грамадскага жыцця, выяўлення народнага характару, яго менталітэту.

**Мэта** вывучэння дадзенай дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб'ектыўнага навуковага погляду на вызначанную праблему, які сфарміраваўся ў працэссе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў; прасачыць канфесійны, сацыяльны, палітычны склад удзельнікаў грамадска-палітычнага руху на розных гістарычных этапах.

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных даследчых і вучэбных **задач**:

- выявіць ступень распрацаванасці вучэбнага курса па перыядах;

- фарміраваць у студэнтаў патрыятычны светапогляд, тлумачыць асновы і прыярытэты ідэалогіі беларускай дзяржавы;
- прасачыць карціну гістарычнага развіцця беларускай канцэпталогіі;
- раскрыць нацыянальны характар інтэрпрэтацыі агульнаеўрапейскай і беларускай культуры і грамадска-палітычнай думкі;
- паказаць сувязь паміж становішчам канфесій і беларускім этнакультурным уздымам у канцы XVI - першай палове XVII ст.; у другой палове XIX - пачатку XX ст.; 20-я гады XX ст.;
- на фоне дынамікі этнакультурных працэсаў у Беларусі даследаваць і вывучаць моўную палітыку і практыку праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай цэркваў, іх уплыў на развіццё грамадска-палітычнай думкі, рухаў;
- разглядаць грамадска-палітычную думку праз прызму нацыянальнай культуры і этнічнай свядомасці народа;
- знаёміць з жыццём і дзейнасцю, духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, палітыкі.

Дадзены вучэбна-метадычны комплекс падрыхтаваны з улікам Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін павінен фарміраваць і развіваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі, забяспечваць рашэнне і выкананне грамадзянскіх сацыяльна-прафесійных задач і функцый.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны карыстацца канкрэтнагістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным і інш.).

Вучебна-метадычны комплекс складаецца з 4 раздзелаў:

- тэарытычны (канспект лекцый па дысцыпліне)
- практычны (планы семінарскіх заняткаў, заданні па кіруемай самастойнай рабоце студэнтаў)
- кантроля ведаў (крытэрыі ацэнкі адукацыйных вынікаў студэнтаў, матэрыялы цякучай і выніковай атэстацыі, пытанні да падрыхтоўкі да экзамену, тэматыка рэфератаў)
- дапаможны (вучэбная праграма, пералік рэкамендуемых навучальных выданняў і інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы рэферата, пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі).

Вучебна-метадычны комплекс прызначаны да самастойнага выкарыстання выкладчыкамі і студэнтамі пры падрыхтоўцы да лекцыйных, семінарскіх заняткаў, а таксама да экзамена.

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 1.1. Канспект лекцый

### Тэма 1. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Метадалогія нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Крыніцы па гісторыі беларускай грамадскай думкі

*Ключавыя паняцці:* гісторыя, грамадска-палітычная думка, перыядызацыя гісторыі грамадска-палітычнай думкі, метады вывучэння гісторыі грамадска-палітычнай думкі, жыційная літаратура, летапісы.

**План лекцыі:** 1.Агульная характарыстыка "Гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі" як навуковай дысцыпліны.
2.Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння курса.
3.Перыядызацыя беларускага гісторыка-культурнага працэсу.
4.Крыніцы вывучэння дадзенай праблемы яе актуальнасць.

***Агульная характарыстыка "Гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі"як навуковай дысцыпліны.*** Гісторыя грамадска-палітычнай думкі побач з палітычнымі трактатамі і філасофскімі сачыненнямі вывучае таксама шматлікія выказванні, зробленыя нацыянальнымі мысліцелямі, дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі, паэтамі і г.д. аб палітычных з'явах у самых розных творах, не развітых да ўзроўню самастойнай і арыгінальнай тэорыі.

*Грамадска-палитычная думка* – гэта спроба асэнсаваць з'яўленне дзяржавы, права, палітыкі, культуры, рэлігіі тады, калі яшчэ адсутнічаюць адпаведныя вучэнні. Яна ўзнікае тады, калі яшчэ не створана сістэма тэарэтычных ведаў. Грамадская думка можа таксама праяўляцца побач з палітычнымі вучэннямі, якія ўзнікаюць на адпаведным этапе развіцця.

Грамадска-палітычная думка можа як папярэднічаць розным вучэнням, так і суіснаваць з імі. Яна вельмі шырокая па ахопу крыніц. Грамадская думка – гэта перш за ўсё рэакцыя той ці іншай часткі грамадства на сучасную ёй палітыку, заканадаўства, культуру, рэлігію і г.д. Грамадская думка можа праяўляцца ў самых розных формах – як у тэарэтычных трактатах, філасофскіх сачыненнях, палітычных памфлетах, праектах канстытуцый, так і ў творах мастацкай літаратуры, у публіцыстыцы, у палітычных прамовах, у выступленнях, гутарках і г.д. Сярод крыніц дамінуюць такія, што змяшчаюць

толькі асобныя, фрагментарныя выказванні і меркаванні аб розных з'явах беларуска грамадства і не носяць характару самастойнай і арыгінальнай тэорыі.

Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі вывучае ўзнікненне і развіццё тэарэтычных палажэнняў аб дзяржаве, палітыцы і заканадаўстве, культуры, рэлігіі, народзе выказаных нацыянальнымі мысліцелямі, рэлігійнымі, грамадскімі і дзяржаўнымі дзеячамі, пісьменнікамі, паэтамі і г.д. у той ці іншай форме. Па-іншаму можна сказаць так: гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі вывучае грамадскія ідэі мінулага, якія выказваліся на Беларусі з адзінаццатага стагоддзя да нашых дзён.

Грамадска-палітычная думка ўзнікае разам з дзяржавай. Яна адлюстроўвае інтарэсы розных сацыяльных класаў і груп, развіваецца на падставе сацыяльных супярэчнасцяў. Грамадскае значэнне набываюць тыя ідэі, выказванні, вучэнні, якія адпавядаюць інтарэсам значнай часткі грамадства, найбольш змястоўна адлюстроўваюць адносіны розных сацыяльных груп да дзяржавы, права, палітыкі, культуры, рэлігіі, заканадаўства. Развіццё грамадскіх поглядаў і ідэй адбываецца як узаемадзеянне дактрын, поглядаў розных сацыяльных класаў і груп. Адны імкнуцца абвергнуць ідэалогію другіх. Найбольшае гучанне атрымліваюць думкі, якія адпавядаюць сацыяльнаму прагрэсу, справядлівасці.

Грамадска-палітычная думка заўсёды цесна звязана з сучаснай ёй палітычнай і прававой рэчаіснасцю. Кожная эпоха нашай гісторыі мела свае, уласцівыя толькі ёй палітычныя і прававыя ўстановы. Менавіта таму ў творах нацыянальных мысліцеляў, рэлігійных, грамадскіх і дзяржаўных дзеячоў, асветнікаў, пісьменнікаў і г.д. адлюстроўваліся розныя палітыка-прававыя праблемы, цесна звязаныя з асаблівасцямі мясцовых дзяржаўных установ і прынцыпаў.

Грамадска-палітычная думка Беларусі мае сваю спецыфіку, звязаную з асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі. Яна ахоплівае не толькі феномены грамадска-палітычнага жыцця, якія паўсталі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, але і тыя, што сфарміраваліся ў межах тых гістарычна абумоўленых геакультурных прастораў, часткай якіх з’яўляліся землі сучаснай Беларусі (тэрыторыі старажытных усходнеславянскіх княстваў у XI – XIII стст., тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – XVIII стст., у пэўнай ступені тэрыторыя Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – XVIII стст., тэрыторыя Віленшчыны ў XIX – першай палове XX стст.), а таксама тыя, якія былі створаны па-за межамі Беларусі і яе геакультурнай прасторы асобамі, цесна звязанымі ў сваім жыцці і дзейнасці з землямі Беларусі.

Пачаткам грамадска-палітычнай думкі Беларусі можна лічыць XI ст. – час з'яўлення на яе геакультурнай прасторы першых твораў, у якіх прысутнічаюць элементы рацыянальна-лагічнага асэнсавання рэчаіснасці.

Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў гэты перыяд характарызуецца станаўленнем феадальнага ўкладу, частковым аддзяленнем рамяства і гандлю ад сельскай гаспадаркі, узнікненнем гарадоў, развіццём рэгіянальных і міжнародных эканамічных сувязяў. Дадзеныя з'явы спрыялі паскарэнню назапашвання пазітыўных ведаў аб свеце ў розных сферах жыцця, пашырэнню светапогляду.

У сацыяльна-палітычным жыцці адбываецца працэс станаўлення дзяржаўнасці спачатку ў форме раннефеадальных княстваў (Полацкае, Тураўскае, Смаленскае, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на ўдзелы), а з сярэдзіны XIII ст. – у форме цэнтралізаванай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, асноўную частку якога складалі землі сучаснай Беларусі.

Раннефеадальныя княствы, а потым ВКЛ уключаюцца ў сістэму міжнародных палітычных адносін у Еўропе. Ускладненне палітычнай арганізацыі патрабавала ад суб'ектаў палітычнай дзейнасці ўмення выпрацоўваць і абгрунтоўваць пэўную пазіцыю з дапамогай рацыянальна-лагічных сродкаў.

У духоўным жыцці важнейшай падзеяй дадзенага перыяду становіцца афіцыйнае прыняцце хрысціянства раннефеадальнымі ўсходнеславянскімі княствамі ў канцы X ст. Хрысціянізацыя адбывалася пад патранатам візантыйскай царквы, якая пасля расколу ў хрысціянстве 1054 г. стала цэнтрам праваслаўнай царквы. Пасля прыняцця хрысціянства ў Кіеўскім княстве каля 988 г. усе ўсходнеславянскія землі былі абвешчаны часткай Кіеўскай мітраполіі, якая падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярхату. На тэрыторыі Беларусі ўтварылася некалькі епархій, падпарадкаваных кіеўскаму мітрапаліту: Полацкая (992 г.), Тураўская (1005 г.), Смаленская (1136 г.). З канца XIV ст. пасля Крэўскай уніі 1385 г. афіцыйнай канфесіяй у ВКЛ становіцца каталіцызм, аднак у духоўна-рэлігійнымжыцці на землях Беларусі працягвала панаваць праваслаўе.

Хрысціянізацыя ва ўсходнеславянскіх землях, у тым ліку і на землях Беларусі, мела сваю спецыфіку. Па першае, працэс хрысціянізацыі адбываўся амаль выключна "зверху", у выніку рэалізацыі волі суб'ектаў дзяржаўнай улады. Гэта прывяло да захавання на працяглы час у грамадскай свядомасці значных элементаў традыцыйнага міфалагічнага светапогляду. Па другое, у якасці царкоўнай была замацавана стараславянская мова, літаратурныя нормы якой былі распрацаваны балгарскімі хрысціянскімі місіянерамі Кірылам і Мяфодзіем у IX ст. на аснове старабалгарскіх моўных дыялектаў. Паступова

гэтая мова становіцца мовай інтэлектуальнай эліты грамадства, на якую перакладаюцца і на якой ствараюцца тэалагічныя і філасофскія творы. Царкоўнаславянская мова паслужыла асновай для фарміравання старабеларускай мовы, якая стала афіцыйнай мовай ВКЛ.

Хрысціянства ў многім абумовіла інтэлектуалізацыю духоўнага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў дадзены перыяд. Яно паўплывала на фарміраванне пісьменства, станаўленне царкоўнай адукацыі, развіццё розных форм духоўнай культуры. Узнікае спецыфічная “кніжная” культура: пры манастырах перапісваюць кнігі і робяць пераклады з грэчаскай мовы на стараславянскую, з’яўляецца арыгінальная літаратура. Пры дапамозе хрысціянства стала магчымай трансляцыя на тэрыторыю сучаснай Беларусі еўрапейскай культурнай спадчыны.

***Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння курса.*** Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі для больш поўнага вывучэння свайго прадмета выкарыстоўвае метадалогію – сукупнасць найбольш агульных прынцыпау, спосабаў навуковага пазнання. Глыбокае і ўсебаковае пазнанне грамадска-палітычнай думкі Беларусі забяспечвае толькі сучасная навуковая метадалогія. У вывучэнні гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі выкарыстоўваюцца наступныя групы метадаў:

- агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, лагічны і інш.);
- уласнагістарычныя (сінхронны, храналагічны, параўнальна-гістарычны, рэтраспектыўны, сістэмны аналіз);
- спецыяльныя ці запазычаныя ў іншых навук (матэматычныя, сацыяльныя, метады сацыяльнай псіхалогіі і інш.).

Доўгі час навуковай метадалогіі папярэднічала суб'ектывісцкая і аб'ектыўна-ідэалістычная метадалогія. У першым выпадку гістарычны працэс тлумачыўся дзеяннем вышэйшых асоб (цароў, фараонаў, імператараў, дыктатараў). У іншым выпадку рашаючая роля ў гістарычным працэсе адводзілася не суб'ектыўным, а аб'ектыўным, але звышчалавечым сілам – Боскі промысел, Абсалютная ідэя і інш. І толькі ў сярэдзіне XIX ст. пачаліся спробы пераводу гістарычных даследаванняў на навуковую аснову.

Метадалагічнай асновай даследавання могуць выступаць пэўныя філасофскія кірункі: дыялектычны матэрыялізм, ідэалізм, а таксама пазітывізм, прагматызм і г.д. Іх выкарыстанне ў многім звязана са светапоглядам вучоных, ступенню іх навуковай сталасці. Яны дазваляюць высветліць асноуныя падыходы да вырашэння праблемы, але не вырашаюць яе канчаткова. Важная роля належыць прынцыпам навуковага гістарычнага пазнання. Сучасныя гісторыкі выкарыстоўваюць такія асноўныя прынцышы навуковага даследавання, як аб'ектыўнасць, гістарызм, сацыяльны падыход.

Прынцып аб'ектыўнасці азначае разгляд гісторыі адпаведна аб'ектыўным заканамернасцям; абапірацца на факты, не скажаючы і не падганяючы іх пад загадзя створаныя схемы; вывучаць кожную з'яву ў сукупнасці яе станоўчых і адмоўных бакоў, незалежна ад адносін да іх.

Прынцып гістарызму патрабуе, каб кожная падзея разглядалася толькі ў гістарычным развіцці, у сувязі з іншымі падзеямі і канкрэтным вопытам гісторыі.

Прынцып сацыялыгага падыходу азначае адмову ад былой партыйнасці ў вывучэнні гісторыі. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам у развіцці гістарычнага працэсу разглядаюцца праявы розных сацыяльных, класавых і партыйных інтарэсаў, праўдзіва паказваюцца іх супярэчнасці і шляхі пераадольвання.

***Перыядызацыя беларускага гісторыка-культурнага працэсу.*** Для разумення своеасаблівасці гісторыі грамадскай думкі Беларусі вялікае значэнне мае перыядызацыя. У яе аснову пакладзена сацыяльна-эканамічнае жыццё, развіццё грамадства. Як частка грамадскай свядомасці, грамадска-палітычная думка цесна звязана з сацыяльна-эканамічным развіццём.

Храналагічна час, які ахоплівае гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі, дзеліцца на шэсць перыядаў.

*1 перыяд*. Грамадска-палітычная думка Сярэднявечча (XI–XV стст.). Гэта нараджэнне і развіццё грамадскіх поглядаў у перыяд узнікнення раннефеадальнай дзяржавы (Кіеўская Русь, Вялікае Княства Літоўскае), станаўлення феадалізму.

На працягу існавання Кіеўскай Русі грамадска-палітычная думка Беларусі (XI–XIII стст.) развівалася пад уплывам візантыйскай культуры і ставіла сваёй мэтай тэарэтычнае абгрунтаванне абсалютнай палітычнай улады, якой прыпісвалася боскае паходжанне. Мовай палітычнай думкі была царкоўнаславянская мова.

Больш змястоўны характар грамадска-палітычная думка Беларусі пачынае праяўляцца з XIV–XV стст., калі паўстала Вялікае Княства Літоўскае і частка жыхароў ВКЛ (у канцы XIV ст.) прыняла каталіцызм. Пачынаецца знаёмства грамадства з заходнееўрапейскай палітычнай культурай, што паклала пачатак дэсакралізацыі свецкай улады, гэта значыць пазбаўленню боскіх атрыбутаў зямных носьбітаў, перш за ўсё тых, хто займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Грамадска-палітычная думка паступова пачынае набываць свае адметныя рысы, спецыфічныя асаблівасці, становіцца на шлях самастойнага развіцця, які адпавядаў палітычным патрэбам і этнічнай самабытнасці беларускай народнасці на стадыі яе фарміравання. Уплыў візантыйскай культуры пачынае слабець, а заходнееўрапейскай – узмацняцца, асабліва пасля таго, як частка шляхецкай моладзі з ВКЛ стала сістэматычна атрымліваць юрыдычную і іншую

вышэйшую адукацыю ў заходнееўрапейскіх каталіцкіх універсітэтах. Мовай грамадскай думкі таго часу становіцца старабеларуская мова.

Асноўнымі прадстаўнікамі палітычнай думкі названага перыяду былі Еўфрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі, Аўрамій Смаленскі, Вялікі князь Вітаўт, Р. Цамблак і іншыя.

*2 перыяд.* Грамадская думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV–XVI ст.). Арыгінальны самабытны характар нацыянальнай грамадскай думкі праявіўся асабліва ярка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (XVI ст.), калі ажыццявіўся пераход ад раннефеадальнай да саслоўна-прадстаўнічай манархіі (першае паседжанне сойму ВКЛ адбылося ў 1492 г.), значнага развіцця дасягнула сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё беларускіх гарадоў, пачаліся выступленні мяшчан супраць прывілеяў духавенства і шляхты. У гэты перыяд усталяваліся пастаянныя шматбаковыя (у тым ліку і духоўныя) сувязі з краінамі Заходняй Еўропы, з'явіліся даволі шматлікія прыхільнікі ідэй гуманізму і Рэфармацыі, у грамадскае жыццё ўвайшло кнігадрукаванне, высокага ўзроўню развіцця дасягнула нацыянальная мова. У гэты час Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Сапега стварылі на беларускай мове цудоўныя помнікі грамадска-палітычнай думкі.

У цэнтры ўвагі беларускіх палітычных мысліцеляў таго часу, як і ў творах прадстаўнікоў заходнееўрапейскай палітычнай думкі, знаходзяцца пытанні роўнасці людзей перад законам, правоў і свабод асобы, рэлігійнай талерантнасці і палітычнага плюралізму, свабоднага і незалежнага нацыянальнага развіцця, неабходнасці нацыянальнага самавызначэння, шанавання ўласных нацыянальных духоўных каштоўнасцей як асновы захавання самастойнасці этнасу і дзяржавы.

Галоўнымі прадстаўнікамі грамадска-палітычнай думкі эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі былі Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Міхалон Літвін, Мікалай Радзівіл Чорны, Андрэй Волан, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Леў Сапега і іншыя.

*3 перыяд.* За эпохай Адраджэння і Рэфармацыі паследаваў неспрыяльны для развіцця нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі перыяд Контррэфармацыі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.), які характарызаваўся:

- засіллем клерыкальнай ідэалогіі;
- падаўленнем свабоднай думкі;
- нецярпімасцю;
- праследаваннем іншадумцаў.

Нацыянальна-палітычныя ідэі ў гэты перыяд знаходзілі выяўленне на лацінскай, польскай і рускай мовах (С. Полацкі), паколькі беларуская з канца

XVII ст., па сутнасці, ужо не ўжывалася. Аднак было б зусім несправядліва цалкам адмоўна ацэньваць гэты перыяд. Менавіта ў гэты час склалася і дзейнічала даволі эфектыўная сістэма сярэдняй адукацыі, паўстаў першы ва Усходняй Еўропе ўніверсітэт (1579). Грамадска-палітычная думка знаходзіла адлюстраванне ў рэлігійна-палемічнай літаратуры. Хаця, безумоўна, імкненне каталіцкай царквы да дамінуючай ролі сваёй ідэалогіі ў грамадскім жыцці адмоўна адбілася на змесце грамадска-палітычнай думкі, развіццё якой да таго ж стрымлівалася крызісам феадальна-прыгонніцкіх адносін.

Асноўныя прадстаўнікі грамадска-палітычнай думкі дадзенага перыяду – Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Канстанцін Астрожскі, Сімяон Полацкі, Казімір Лышчынскі, Афанасій Філіповіч і інш.

*4 перыяд.* Грамадска-палітычная думка веку Асветы (другая палова XVIII ст.). З сярэдзіны XVIII ст. на беларускіх землях распаўсюджваецца асветніцкая ідэалогія, накіраваная супраць магнацкай алігархіі і клерыкалізму, перажыткаў прыгонніцтва. Зыходзячы з тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы, яе прадстаўнікі прапаноўвалі розныя праекты рэфармавання грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай з улікам вопыту буржуазных краін Заходняй Еўропы. Прымаецца Канстытуцыя 3 Мая 1791 г. – адна з першых у свеце (побач з канстытуцыямі ЗША і Францыі). Аднак гэтыя праекты не маглі рэалізавацца ў грамадска-палітычным жыцці так, як гэта было ў заходнееўрапейскіх краінах, таму што сацыяльныя сілы, зацікаўленыя ў рэфармаванні грамадства, былі слабымі і пазбаўленымі дзяржаўнай падтрымкі, паколькі да канца XVIII ст. Рэч Паспалітая канчаткова страціла сваю незалежнасць.

Прадстаўнікі асветніцкай ідэалогіі: М. Пачобут-Адляніцкі, І. Страйноўскі, І. Храптовіч, Т. Касцюшка, Я. Ясінскі, Ю. Нямцэвіч, І. Яленскі і інш.

*5 перыяд.* Грамадска-палітычная думка канца XVIII – пачатку XX ст. (1795–1918) – вельмі складаны і недастаткова вывучаны перыяд. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) землі ВКЛ былі інкарпараваны ў склад Расійскай імперыі. Галоўнай праблемай, якая паўстала і дамінавала ў грамадскай свядомасці на працягу ўсяго гэтага часу, з'яўлялася адраджэнне беларускай дзяржаўнасці ў той ці іншай форме. Менавіта ў гэты перыяд у грамадскай думцы канчаткова сфарміравалася беларуская нацыянальная ідэя, радавод якой пачынаецца ад XVI ст. Усе галоўныя напрамкі палітычнай думкі Беларусі – лібералізм, кансерватызм, рэвалюцыйны дэмакратызм, марксізм – актыўна абмяркоўвалі яе, па-рознаму бачылі шляхі рэалізацыі, яе ўвасабленне ў рэчаіснасці. Найбольш змястоўны шлях ажыццяўлення беларускай ідэі прапаноўвалі прадстаўнікі беларускага нацыянальнага адраджэння канца XIX –

пачатку XX ст. браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Вацлаў Ластоўскі і інш.

*6 перыяд.* Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі і беларускага замежжа (1919–1991). Гэта важны, своеасаблівы і супярэчлівы перыяд у гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Стварэнне БССР дазволіла беларускай нацыі кансалідавацца, атрымаць адміністрацыйна-тэрытарыяльную і культурную аўтаномію ў рамках СССР, зацвердзіць рэспубліканскае і мясцовае самакіраванне, дабіцца міжнароднага прызнання.

У гэты час былі распрацаваны праекты чатырох Канстытуцый БССР, прыняцце якіх у 1919, 1927, 1937 і 1978 г. з'явілася юрыдычнай базай для распрацоўкі нацыянальнага заканадаўства. У перадваенныя і пасляваенныя гады грамадазнаўцы і філосафы Савецкай Беларусі ў сваіх публікацыях настойліва праводзілі галоўныя палажэнні марксісцкага вучэння пра тое, што ўзяўшыя дзяржаўную ўладу ў свае рукі працоўныя пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў кароткі гістарычны тэрмін здольны пабудаваць сацыялістычнае грамадства, заканадаўча замацаваць дэмакратычныя правы і свабоды, развіваць і ўдасканальваць сацыялістычную дэмакратыю. Аднак рэчаіснасць давала ўсё больш і больш доказаў разыходжання марксісцкай тэорыі з практыкай.

Іншыя праблемы вырашала грамадска-палітычная думка Заходняй Беларусі (1921–1939). У 1921 г. паводле Рыжскага мірнага дагавору частка тэрыторыі БССР (каля 82 тыс. км. кв. плошчы і каля 4,5 млн. чалавек насельніцтва) была ўключана ў склад Польшчы. У адносінах да беларусаў польскі ўрад праводзіў шавіністычную палітыку паланізацыі і асіміляцыі, ажыццяўляў бязлітасную эксплуатацыю. Насельніцтва Заходняй Беларусі вяло пастаянную барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. Нацыянальна-вызваленчы рух працоўных з 1923 г. узначаліла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Пад яе кіраўніцтвам дзейнічалі Беларуская сялянска-рабочая грамада, “Змаганне” і іншыя палітычныя партыі і грамадскія рухі. Іх дзейнасць грунтавалася на адпаведнай палітычнай ідэалогіі.

Пэўныя ідэі выказвалі ў гэты перыяд і прадстаўнікі беларускай эміграцыі. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі грамадскай думкі гэтага перыяду былі В.Г. Кнорын, А.Ф. Мяснікоў, А.Р. Чарвякоў, І.Д. Луцэвіч (Янка Купала), К.М. Міцкевіч (Якуб Колас), П.К. Панамарэнка, К.Т. Мазураў, П.М. Машэраў, І. Дварчанін, Б. Тарашкевіч, А. Станкевіч, Я. Пятроўскі і інш.

***Крыніцы вывучэння дадзенай праблемы яе актуальнасць.*** Першакрыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай думцы шматлікія па колькасці і разнастайныя па форме выкладання. Гэта перш за ўсё:

- жыційная літаратура (напрыклад, “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”);

• *летапісы* (“Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”);

• палітычныя памфлеты (“Прытча пра сляпога і кульгавага” Кірылы Тураўскага);

• пасланні (“Послание к Фоме Пресвитеру” Клімента Смаляціча);

• прадмовы, альбо ўступныя артыкулы да перакладзеных і выдадзеных беларускімі культурнымі дзеячамі кніг (“Прадмова” Ф. Скарыны да Бібліі, альбо “Прадмова” С. Буднага да кнігі А. Фрыч Маджэўскага “Пра выпраўленне Рэчы Паспалітай”);

• творы рэлігійна-палемічнай літаратуры (творы П. Скаргі “Апісанне і абарона Брэсцкага сабору”, Х. Філалета “Апокрысіс”, М. Сматрыцкага “Фрынас, альбо лямант усходняй царквы”);

• творы мастацкай літаратуры (паэтычныя зборнікі С. Полацкага “Рыфмалогіён” і “Вертаград мнагацветны”);

• розныя публіцыстычныя матэрыялы, змешчаныя на старонках газет, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі (“Мужыцкая праўда”, “Наша доля”, “Наша Ніва”; заўважым, што першая газета з'явілася на тэрыторыі Беларусі ў 1776 г.);

• эпісталярная спадчына (ліст С. Буднага да Генрыха Булінгера, альбо Л. Сапегі да біскупа Іасафата Кунцевіча);

• палітычныя трактаты і філасофскія сачыненні (працы А. Волана “Пра палітычную, альбо грамадзянскую свабоду”, А. Алізароўскага “Аб палітычнай супольнасці людзей”) і г.д.

Такім чынам, ніякае крытычнае выкладанне, пераказ поглядаў таго ці іншага мысліцеля, зроблены сучасным даследчыкам, не можа замяніць непасрэднага знаёмства з тым ці іншым творам нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі. Толькі непасрэднае знаёмства з першакрыніцамі, іх чытанне і самастойны аналіз могуць даць яснае ўяўленне аб асаблівасцях грамадска-палітычных поглядаў таго ці іншага мысліцеля, па-сапраўднаму асэнсаваць здабыткі і заканамернасці гісторыі нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі. Таму зразумела, якое вялікае значэнне для яе вывучэння мае выданне першакрыніц па гісторыі грамадска-палітычнай думцы Беларусі. Для прыкладу, дастаткова назваць такія выданні, як “Беларускія летапісы і хронікі” (Мінск, 1997), “Кніга жыцій і хаджэнняў” (Мінск, 1994), Францыск Скарына “Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія” (Мінск, 1990), “Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны” (Мінск, 1991), “Экологическая мысль восточных славян: Антология” (Мінск, 1995), М. Літвін “О нравах татар, литовцев и москвитян” (Масква, 1994), “Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі” (Мінск, 1988), С. Полацкі Вертоград многоцветный” (Масква, 1994), Г. Каніскі “Нравственная философия или этика” (Кіеў, 1987) і многае інш.

Першакрыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай думцы Беларусі дайшлі да нас на шасці мовах: царкоўнаславянскай, старажытнабеларускай, беларускай, лацінскай, польскай і рускай.

*Актуальнасць* вывучэння дысцыпліны "Грамадска-палітычная думка" абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб'ектыўнага навуковага погляду на вызначаную праблему, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў.

**Тэма 2. Зараджэнне грамадска-палітычнай думкі на старажытна-беларускіх землях XI–XIII стст. Палітычны змест старажытнарускіх летапісаў. Палітычная думка XIV–XV стст. Сярэдневяковыя ерасі. Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў (XIV–XV стст.)**

*Ключавыя паняцці:* Кіеўская Русь**,** летапіс, "Аповесць мінулых гадоў", духоўная спадчына, старажытнае права.

**План лекцыі:** 1.Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў.
2.Полацкае і Тураўскае княствы.
3.Грамадска-палітычныя ідэі "Слова пра паход Ігаравы" і "Аповесці мінулых часоў".
4.Летапісанне.
5.Асноўныя рысы старажытнага права Беларусі.

***Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў.*** Узнікненне інстытутаў дзяржавы звязваецца з распадам абшчыннага ладу, пераходам да суседскай абшчыны, паступовым выдзяленнем сярод агульнай масы вытворцаў прадстаўнікоў адміністрацыйна-саслоўнай сістэмы, са спецыялізацыяй і канцэнтрацыяй вытворчасці, узнікненнем гарадоў і г.д.

Працэс дзяржаваўтварэння ў значнай ступені залежаў ад развіцця таварна-грошаых і вытворчых адносін, геаграфічна-эканамічных умоў існавання таго ці іншага грамадства.

Працэс узнікнення славянскіх дзяржаў звязаны таксама з Вялікім перасяленнем народаў (IV–VI стст.). калі пачалося дзялення славян на 3 буйныя галіны. Але славяне былі не першымі, хто пачаў у Еўропе будаўніцтва ўласных дзяржаў. Першымі былі франкі, якія ў III ст. утварылі племянныя аб'яднанні, а

ў VI ст. –феадальную дзяржаву. Першыя прадзяржаўныя славянскія ўтварэнні ўзніклі ў канцы VI – пачатку VII ст. на Балканскім паўвостраве, у даліне Альпійскіх гор і Паўночных раёнах сучаснай Аўстрыі. Менавіта на гэты час (VI–VII стст.) прыпадае пранікненне славян на тэрыторыю сучаснай Беларусі.

З сярэдзіны IX ст. сярод усіх усходніх славян ствараецца дзяржаўна-грамадская арганізацыя. Плямёны крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў ідуць па тым жа гістарычнам шляху.

*Кіеўская Русь* сфарміравалася ў апошняй чвэрці IX ст. і праіснавала да 30-х гг. XII ст. Фактычна, гэта сярэднявечная дзяржава ўтварылася шляхам аб'яднання розных культур. У перыяд свайго найвышэйшага росквіту Кіеўская дзяржава распасціралася на 800 тыс. кв. км, ад Таманскага паўвострава да Паўночнай Дзвіны. З самага пачатку свайго з'яўлення гэта была дзяржава, якая ўзнікла на гандлёвым шляху "з варагаў у грэкі". Усходнія славяне, як і некаторыя іншыя народы, у сваім развіцці мінавалі рабаўладанне.

Кіеўская Русь адыграла важную ролю ў гісторыі славянскіх народаў. Аб'яднанне ўсіх усходнеславянскіх плямён у адзінай дзяржаве спрыяла іх грамадска-эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму развіццю, значна ўмацавала іх у барацьбе з агульным ворагам. Ваенная сіла Кіеўскай Русі стала тым шчытом, аб які разбіліся шматлікія орды качавых плямён Стэпу (печанегі, полаўцы, хазары), імкнуўшыеся падыйсці да межаў Візантыі і нападаўшыя на краіны Цантральнай Еўропы.

Аднак імперыя Рурыкавічаў не была цанталізаванай дзяржавай. Яна ўяўляла сабой палітычнае аб'яднанне феадалаў вакол вялікага князя з мэтай адпору пастаянным нападам знешніх ворагаў і ажыццяўлення збору даніны з уласнага насельніцтва. У XI-XII стст. – рост вытворчых сіл, узнікненне новых эканамічных цэнтраў, узмацненне ўлады князёў на месцах, пастаянныя міжусобіцы, а ў выніку – феадальная раздробленасць, прывялі да распаду Кіеўскай Русі.

***Полацкае і Тураўскае княствы.*** У X-XI стст. Полацкае княства з'яўлялася адным з буйнейшых княстваў на тэрыторыі Усходняй Еўропы і сапернічала з Кіевам і Ноўгарадам у аб'яднанні зямель і валоданні волакамі. У апошняй чвэрці X ст. тут, незалежна ад Кіева і ад Ноўгарада, правіў Рагвалод, першы, чыё імя вядома па пісьмовым крыніцам. У часы Рагвалода Полацкае княства – магутная, суверэнная, дзяржава.

Сведчаннем прызнання Полацка з боку Ноўгарада і Кіева могуць быць падзеі, занатаваныя летапісцамі пад 980 г., падчас якіх Уладзіміру ўдалося на нейкі час сабраць пад сваей уладай вялікія абшары ўсходнееўрапейскіх славянскіх зямель, у т. л. болшасць тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Пачатак палітычнаму адраджэнню Полацкага княства на мяжы X-XI стст. паклаў князь Ізяслаў (Уладзіміравіч). Ізяслаў спрыяў распаўсюджванню тут хрысціянства. Сын Ізяслава Брачыслаў вёў актыўную барацьбу за валоданне волакамі, у 1021 г. былі далучаны Віцебск і Усвяты.

Другая палова XI ст. звязана з імем буйнейшага ўсходнееўрапейскага палітычнага дзеяча – князя Усяслава (1044-1101). З пачатку 60-х гадоў XI ст. Усяслаў выходзіць на ўсходне-еўрапейскую арэну: падтрымаў Кіеў у барацьбе з качэўнікамі; падкрэсліў дзяржаўную асобнасць Полацка і засведчыў свету яго роўнасць з Кіевам і Ноўгарадам узвядзеннем Сафійскага сабора. Выкарыстаўшы спрыяльныя палітычныя абставіны: пачатак распаду старажытнай Русі, міжусобную барацьбу, якой былі адцягнуты сілы Кіева, – "поча Всеслав рать держать". У 1065 г. ён са сваей дружынай напаў на Пскоў, але ўзяць не змог. У 1066 г. полацкая дружына рушыла на Ноўгарад, разрабавала яго. У знак падначалення Ноўгарада паздымала званы з Сафійскага сабора і прывезла ў Полацк – на свой Сафійскі сабор. Абураныя такімі паводзінамі Яраславічы – сыны Яраслава Мудрага падышлі да Менска. Адбылася бітва на Нямізе 1067 г. і ўпершыню згадваецца ў летапісах Менск.

Эпоха Усяслава была часам наибольшей магутнасці Полацкай зямлі. З яго смерцю княства падпала пад працэс феадальнай раздробленасці. У самастойныя ўдзелы вылучыліся Менск, Віцебск, Друцк, Ізяслаўль і Лагожск, Лукомль. У XII ст. даволі хутка расла палітычная роля Менска, які стаў сапернікам Полацка ў аб'яднанні зямель.

*Тураўскае княства* знаходзілася на землях дрыгавічоў, у басейне ракі Прыпяць. Калі Заходняя Дзвіна – вялікі гандлёвы шлях з Балтыкі на поўдзень, то Прыпяць – важны гандлёвы шлях паміж Кіевам і Заходняй Еўропай. Да таго тут былі ўрадлівыя землі, спрыяльны мяккі клімат і лясы, багатыя на дзічыну і сыравіну. Усе гэта спрыяла больш хуткаму развіццю земляробства, аддзяленню рамяства і станаўленню ранняга феадальнага грамадства.

Першы галоўны горад княства – Тураў упершыню ўзгадваецца пад 980 г. у сувязі з князем Турам, які, як і Рагвалод Полацкі, быў з варагаў. Але хутка Тураў быў падпарадкаваны суседняму Кіеву, і тут склалася традыцыя – Тураў атрымліваў старэйшы сын вялікага кіеўскага князя, які займаў потым бацькава месца ў Кіеве, а Тураў зноў атрымліваў старэйшы сын новага кіеўскага князя.

Князь Тураўскай зямлі Юры Яраслававіч аднавіў дынастыю тураўскіх князёў Ізяслсвічаў у 1157 г. Як і Ўсяслаў Чарадзей, ён меў некалькі сыноў, паміж якімі падзяліў сваё княства. Былі ўтвораны ўдзелы – Тураўскі, Пінскі, Клецкі, Слуцкі, Дубровіцкі. З цягам часу дробныя княствы трапілі ў залежнасць ад магутнага галіцка-валынскага князя.

Асаблівасці палітычнага ладу ў Тураўскім княстве. Вялікую ролю ў Тураве адыгрывала веча. Менавіта з яго згоды Кірыла Тураўскі быў абраны епіскапам Турава. У Тураве існавала некалькі адміністратыўных пасад, што выконвалі функцыі, блізкія да некаторых княжаскіх функцый. Так, тысяцкі ўзначальваў гарадское апалчэнне, яго абавязак – ваеннае кіраўніцтва. Акрамя таго, у Тураве дзейнічаў пасаднік – галоўны кіраўнік цывільнай адміністрацыі княства. Такая пасада яшчэ існавала толькі ў Ноўгарадзе Вялікім.

Калі Полацкае княства змагалася з крыжакамі, Тураўскае княства, разам з іншымі рускімі княствамі пазнала жорсткасць мангола-татарскай няволі. У 1240-1241 гг. былі разрабаваны і спалены паўднёвабеларускія гарады, у тым ліку Гомель, Мазыр, Брэст.

***Грамадска-палітычныя ідэі "Слова пра паход Ігаравы" і "Аповесці мінулых часоў".*** Заклік да яднання ўсходнеславянскіх князеў, да барацьбы за незалежнасць Старажытнарускай дзяржавы знайшлі яркае адлюстраванне ў "Слове пра паход Ігаравы" – выдатным помніку старажытнарускага эпасу часоў Кіеўскай Русі.

Ен створаны невядомым аўтарам у канцы XII ст. адразу пасля няўдалага паходу Ноўгарад-Северскага князя Ігара Святаславіча на полаўцаў у 1185 г. Паход, які скончыўся паражэннем і паланеннем князя полаўцамі, паслужыў аўтару падставай для цяжкага роздуму над лёсам Старажытнарускай дзяржавы. Прычыну няўдачы паходу князя Ігара на полаўцаў аўтар бачыць у феадальнай раздробленасці Кіеўскай Русі, у княскіх міжусобіцах, у адсутнасці згоды і адзінства паміж князямі, у няспынных нападках знешніх ворагаў. Асуджаючы своекарыстлівую палітыку князеў, аўтар заклікае іх спыніць сваркі, служыць справе ўмацавання і абароны ўсходнеславянскіх зямель, аднаўленню палітычнага аўтарытэту Кіева, заклікае князеў да згоды.

Такім чынам, галоўная ідэя "Слова пра паход Ігаравы" – заклік старажытнарускіх князеў да яднання. Яна мела вялікае значэнне для абуджэння ў самасвядомасці насельніцтва Кіеўскай Русі ідэі ўсходнеславянскага адзінства. Аднак заклік "Слова" да адзінства, як гэта часта бывае, не быў пачуты сучаснікамі і Кіеўская Русь скончыла свае гістарычнае існаванне.

У гэты перыяд на усходнеславянскіх землях выпрацоўваюцца ідэі незалежнасці Старажытнарускай дзяржавы і царквы ад Візантыі, пры захаванні вернасці праваслаўю. Асабліва яркае адлюстраванне ідэі самастойнасці і суверэннасці Кіеўскай Русі знаходзіць у старажытнарускіх летапісах і, перш за ўсе, у выдатным летапісным зводзе "Аповесць мінулых гадоў".

Па меркаванню болынасці даследчыкаў, гэты выдатны помнік старажатнарускага летапісання быў створаны ў пачатку XII ст. манахам Кіева-

Пячорскага манастыра – Нестарам. У першапачатковым выглядзе праца Нестара не захавалася. Яна дайшла да нас дзякуючы шматлікім рэдакцыям і рукапісным спісам. Сярод іх найбольш старажытныя, блізкія да аўтарскага арыгінала Лаўрэнцьеўскі (1377), Іпацьеўскі (XV ст.) і Радзівілаўскі (XV ст.).

Выкладзеная ў “Аповесці мінулых гадоў” думка, вырашала адразу некалькі палітычных праблем і, перш за ўсе, абгрунтавала ідэю незалежнасці Старажытнарускай дзяржавы ад Візантыйскай імперыі. Яна залікала таксама варагаваўшых усходнеславянскіх князеў, у сілу агульнасці іх генеалагічнага паходжання, да прымірэння.

У “Аповесці мінулых гадоў” захаваліся таксама каштоўныя звесткі пра Полацк і Полацкую зямлю, пра першых полацкіх князеў – Рагвалода і яго дачку Рагнеду, Брачыслава і яго сына Усяслава Чарадзея.

***Летапісанне.*** Летапісанне XVI – XVIII стст. у Беларусі працягвала традыцыі рускага летапісання XI – XIII стст.., пачынаючы з “Аповесці мінулых гадоў”. Нікіфараўскі, Супрасльскі, Віленскі, часткова Слуцкі паўтараюць агульнарускія летапісныя зводы. Віцебскі летапіс, Баркалабаўская і Магілёўская хронікі адметныя тым, што ў аснове іх ляжыць мясцовы матэрыял. Адзначым адно, што гэтыя летапісы, напісаныя рознымі аўтарамі, маюць свае падабенствы і свае адрозненні.

Найбольш значным мясцовым летапісам XVI – пач. XVII ст. з’яўляецца Баркалабаўская хроніка, у якой у значнай ступені нейкі жыхар, ці манах, ці свяшчэннік сяла Баркалабава адлюстраваў мясцовыя, рэлігійныя і палітычныя падзеі таго часу. Традыцыі Баркалабаўскай хронікі працягнулі першыя летапісцы г. Магілёва Трафім Сурта і Юрый Трубніцкі, склаўшыя не менш, а магчыма і больш значную Магілёўскую хроніку.

Віцебскі летапіс таксама стварала група віцебскіх гараджан: Міхаіл Панцырны, Ян Чарноўскі, Гаўрыла і Стафан Аверкі. Тэкст летапісу значна адрозніваецца ад Баркалабаўскай і Магілёўскай хронік. Віцебскі летапіс таксама не адмаўляе залежнасці чалавечага жыцця і лёсу ад усемагутных сіл прыроды. Год за годам перад чытачом праносяцца жахлівыя карціны мору, голаду, пажараў, паводкаў, марозаў, бур, камет, якія прадказвалі бяду, ад якіх ў першую чаргу пакутаваў чалавек.

Вывучэнне летапісаў мае першаступеннае значэнне для больш глыбокага і аб’ектыўнага ўзнаўлення панарамы беларускай старажытнай літаратуры, для правільнага высвятлення многіх важных працэсаў, што адбываліся ў жыцці грамадства.

***Асноўныя рысы старажытнага права Беларусі.*** Узнікненне старажытных дзяржаў на тэрыторыі Беларусі суправаджалася фарміраваннем старажытнага феадальнага права. У старажытнасці пануючым было звычаёвае

права. Яно ўяўляла сабой сістэму прававых норм, якія ўзніклі непасрэдна з грамадскіх адносінах, што абапіраліся на агульнапрымальнасць і даўнасць ужывання і былі санкцыяваны дзяржавай.

З далейшым развіццём і ўмацаваннем феадальных адносін ствараліся ільготы для пануючага класа. Таму ад дзяржавы патрабавалася выданне спецыяльных законаў, дапаўненняў і тлумачэнняў да норм звычаёвага права. Так ствараліся нормы пісанага права, якія спачатку не адмянялі норм звычаёвага права, а толькі дапаўнялі іх, надавалі ім агульнадзяржаўны характар.

Для старажытнага звычаёвага права Беларусі характэрны наступныя рысы: партыкулярызм, традыцыяналізм і дуалізм.

Партыкулярызм права звязаны з наяўнасцю ў кожнай мясцовасці сваіх звычаяў, норм, правіл і адсутнасцю агульнадзяржаўнай прававой сістэмы.

Традыцыяналізм і кансерватызм прававых норм, іх нязменнасць у многім былі абумоўлены ўплывам царквы. Усякія спробы крытыкаваць ці змяняць сацыяльна-эканамічную, палітычную ці прававую сістэму лічыліся ерассю, выступленнем супраць царквы і Бога.

Дуалізм (дваістасць) звычаёвага права заключаўся ў ідэі поўнага бяспраўя рабоў (халопаў, чэлядзі нявольнай) і фармальнай роўнасці свабодных людзей пры фактычным стварэнні ільгот і пераваг пануючаму класу.

## Лекцыя 3. Палітычная і прававая думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV – XVI ст.)

*Ключавыя паняцці*: гуманізм, пазнанне, Адраджэнне, Рэфармацыя, лютэранства, кальвінізм, іезуіцкі калегіум.

**План лекцыі:**

1. Характарыстыка грамадска-палітычнага жыцця Еўропы ў Новы час. Распаўсюджванне гуманістычнай ідэі.
2. Асноўныя тэндэнцыі развіцця грамадска-палітычнай думкі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі. Уплыў розных рэфармацыйных плыняў на развіццё грамадскай думкі ВКЛ.
3. Распаўсюджванне лютэранства, кальвінізму (памяркоўныя і радыкальныя напрамкі). Іезуіцкі калегіум.

***Характарыстыка грамадска-палітычнага жыцця Еўропы ў Новы час. Распаўсюджванне гуманістычнай ідэі.*** Эпоха Адрадження або Рэнесанса цесна звязана з пачаткам капіталістычнага спосабу вытворчасці, перадумовамі якога было прымяненне ў сярэдзіне XV ст. ў Заходняй Еўропе пораху, компаса і

вынаходства кнігадрукавання. З'яўленне агнястрэльнай зброі зрабіла радыкальны пераварот у ваеннай справе і звяло амаль на нішто ратнае значэнне і выхаванне рыцараў – феадалаў.

Компас, які надзвычай павялічываў магчымасці мараплавання, прывеў да вялікіх геаграфічных адкрыццяў канца XV пачатку XVI ст. (адкрыцце Амерыкі Х. Калумбам, марскога шляху ў Ідыю Васка дэ Гама, першае кругасветнае падарожжа Магелана), якія заклалі асновы для пазнейшага сусветнага гандлю і для пераходу рамяства ў мануфактуру, якая, у сваю чаргу, паслужыла зыходным пунктам для сучаснай буйной прамысловасці ‖.

Кнігадрукаванне, адначасова з важнейшым сродкам выражэння новага светапогляду – гуманізму (ад лацінскага слова hymanitas – чалавечнасць), які ў адрозненне ад панаваўшай рэлігіі паставіў у цэнтр сваіх інтарэсаў не бога, а чалавека з яго зямнымі справамі і патрэбамі, гучна абсвяціўшы права чалавека на іх задавальненне на зямлі.

У сярэднявечнай культуры *пазнанне* – гэта сузіранне, рэлігійны экстаз, прытрымліванне рэлігійнай догме; для Адраджэння пазнанне – гэта шлях да раскрыцця боскіх пачаткаў ў чалавеку. Такі антрапацэнтрычны паварот у светапоглядзе эпохі Адраджэння прывёў да шырокага распаўсюджання ідэй гуманизма. Буйнейшымі гуманістамі эпохі Адраджэння былі Рафаэль Санці, Леанарда да Вінчы Мікеланджэла ў Італіі, Рабле і Мантэнь у Францыі, Шэкспір і Мор у Англіі, Ульрых фон Гутэн у Германіі, Капернік ў Польшчы. У Беларусіі імі былі Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі.

***Асноўныя тэндэнцыі развіцця грамадска-палітычнай думкі ў эпоху Адраджэння, Рэфармацыі. Уплыў розных рэфармацыйных плыняў на развіццё грамадскай думкі ВКЛ.*** У XV– першай палове XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася прыкладна на тым жа ўзроўні, што і краіны Заходняй Еўропы. Паўстаў вышэйшы заканадаўчы орган – вальны (агульны) сойм, адбыўся пераход ад раннефадальнай да саслоўна-прадстаўнічнай манархіі. У духоўным жыцці ўсе большую ролю адыгрывала каталіцкая, а таксама праваслаўная царква, дамінаваў рэлігійны светапогляд. Паступова расце значэнне гарадоў. Яны дабіваюцца самакіравання (магдэбурскае права), ператвараюцца ў самастойныя адміністратыўна-гаспадарчыя цэнтры, у якіх канцэнтраваліся рамесная вытворчасць і гандаль, фармуецца новы грамадскі клас – буржуазія. Сярод жыхароў гарадоў спее незадаволенасць, дробезнай рэгламентацыяй у эканамічнай сферы, засіллем царквы ў духоўным жыцці, выхаваннем і адукацыяй у царкоўных і манастырскіх школах, якую да таго ж у той час можна было набыць толькі на царкоўна-славянскай альбо лацінскай мовах.

*Рэфармацыя* – гэта сацыяльна-палітіічны і ідэалагічны рух накіраваны супраць рымска-каталіцкай царквы і яе ролі ў палітычнай сістеме грамадства. Ідэйна падрыхтаваў Рэфармацыю гуманізм эпохі Адраджэння, які выступіў з крытыкай сярэднявяковага светапогляду і разам з тым, абгрунтаваў прынцыпы буржуазнага індывідуалізма.

Ідэолагі Рэфармацыі стварылі вучэнне аб тым, што для выратавання душы веруючага не патрабуецца пасрэдніцтва каталіцкай царквы, таму што выратаванне адбываецца не вонкавым праяўленнем рэлігійнасці (добрымі справамі), а ўнутранай верай. Рэфармацыйнае вучэнне, такім чынам, адмаўляла неабходнасць існавання каталіцкай царквы з усей яе складанай іерархіяй на чале з папай, а таксама шматлікага каталіцкага духавенства як асобнага сацыяльнага слоя, які згодна з вучэннем царквы перадае чалавеку божую ласку.

Ідэолагі Рэфармацыі патрабавалі секулярызацыі (адчужэння) царкоўнай маемасці, перш за ўсе, зямельнай уласнасці каталіцкай царквы на карысць дзяржавы і прыватных асоб, ліквідацыі каталіцкіх кляштараў і манахаў, адмену царкоўнай дзесяціны, пышнага каталіцкага культу, стварэнне дэмакратычнай і самакіравальнай таннай царквы.

Адзінай крыніцай веры ідэолагі Рэфармацыі абвясцілі Свяшчэннае пісанне (г.зн. Біблію) і адмаўлялі значэнне Свяшчэннага падання (г.зн. прац айцоў царквы, заканадаўчых актаў, прынятых на царкоўных саборах (канонаў), папскіх дэкрэтаў і пасланняў).

Духоўнай радзімай Рэфармацыі з'явілася Германія. Пачатак рэфармацыйнаму руху паклала выступленне прафесара тэалогіі Вітэнбергскага ўніверсітэта Марціна Лютэра (1483-1546) 31 кастрычніка 1517 г., у якім ён асудзіў гандаль папскімі індульгенцыямі. М. Лютэр стаў заснавальнікам аднаго з галоўных напрамкаў рэфармацыйнага руху – *лютэранства,* якое з Германіі пашыраліся ў хуткім часе ў скандынаўскіх краінах Швецыі, Фінляндыі, Даніі, Нарвегіі, а таксама Усходняй Прусіі і Лівоніі.

Больш радыкальным напрамкам Рэфармацыі стаў *кальвінізм,* заснаваны перасяліўшымся з Францыі ў Жэневу Жанам Кальвінам (1509-1564). Кальвінізм паслядоўна праводзіў дэмакратычныя прынцыпы ў арганізацыі кальвінісцкіх абшчын – кожная абшчына выбірала сваіх святароў. З Швейцарыі кальвінізм хутка пашырыўся ў Францыі, Нідэрландах, Шатландыі.

У другой чвэрці XVI ст. рэфармацыйныя ідэі пачынаюць распаўсюджвацца на тэрыторыі ВКЛ, дзе эканамічныя, палітычныя і ідэалагічныя пазіцыі каталіцкай царквы таксама былі вельмі моцнымі і ўзбуджалі ўсеагульнае незадавальненне насельніцтва – заможных гараджан, шляхты, гарадской і вясковай беднаты і нават магнатаў. Перш з ўсе, рэфармацыйныя ідэі знайшлі прыхільнікаў сярод жыхароў беларускіх гарадоў. “Галоўная прычына

пашырэння ў нас Рэфармацыі ляжала ў тым, – адзначыў Максім Гарэцкі, – што наша купецтва, мяшчане, рамеснікі знайшлі ў новых ідэях водгук на іх уласнае незадаваленне панаваўшым у нас ладам жыцця”. Рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ галоўным чынам у формах лютэранства, кальвінізма і арыянства (антытрынітарызма).

***Распаўсюджванне лютэранства, кальвінізму (памяркоўныя і радыкальныя напрамкі). Іезуіцкі калегіум.*** Пачатак Рэфармацыі на беларускіх землях звязаны, распаўсюджаннем тут лютэранскіх ідэй. Лютэранства пачало пранікаць на землі ВКЛ ў 20-я гады XVI ст. з Усходняй Прусіі і Лівоніі (сучасная Латвія). Насельніцтва Лівоніі прыняло лютэранства ў 1522, а Усходняя Прусія – у 1525 г. Адсюль пратэстантызм пачаў распаўсюджвацца сярод гарадскіх жыхароў і шляхты Беларусі і Літвы.

У барацьбе за свае палітычныя і эканамічныя правы супраць феадалаў і царквы буржуазія пачала выкарыстоўваць выпрацаваныя на Захадзе ў XIV-XVI стст. гуманістычныя і рэфармацыйныя ідэі.

Лютэранскія ідэі траплялі на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага і непасрэдна з Германіі. Іх праваднікамі былі студэнты з ВКЛ, якія навучаліся ў нямецкіх універсітэтах, асабліва ў Ляйпцыгскім. Універсітэт у Крулеўцу (Кенісбергу) быў створаны спецыяльна для распаўсюджвання лютэранства на землях Вялікага Княства Лютоўскага і Польшчы. Ва ўніверсітэце было заснавана некалькі кафедр на польскай, літоўскай і беларускіх мовах, а таксама ўстаноўлена некалькі стыпендый для выхадцаў з Беларусі, Літвы і Польшчы.

Лютэранства не аказала якога – небудзь значнага ўплыву на насельніцтва Беларусі і Літвы. Яно падтрымлівала ідэю незалежнасці свецкай улады ад царкоўнай (каталіцкай царквы), спрыяла станаўленню абсалютызму. Паўстаўшы супраць бюракратычнай арганізацыі каталіцкай царквы, адхіліўшы вярхоўную ўладу рымскага папы, лютэранства перадало гэтую ўладу ў германскіх і скандынаўскіх краінах у рукі свецкіх князеў і каралеў, што знайшло адлюстраванне ў прынцыпе: «Чыя дізяржава,таго і вера». Такім чынам лютэранства падтрымлевала ідэю моцнай свецкай улады, што ў палітычных умовах ВКЛ сярод мясцовай шляхты было зусім непапулярным, паколькі апошняя была прыхільніцай рэспубліканскіх ідэй, прынцыпаў шляхэцкай дэмакратыі. Таму найбольшае распаўсюджванне сярод прыхільнікаў Рэфармацыі атрымаў кальвінізм з яго рэспубліканскімі і дэмакратычнымі ідэямі.

*Іезуіцкія калегіўмы* сталі ўдарнай сілай каталіцкай царквы ў барацьбе з рэфармацыйнымі плынямі. Ігнат Лайола ствараў супольнасць людзей, не падобных на традыцыйнае манаства. “Таварыства Езуса” І. Лайола пабудаваў

па ваеннаму ўзору: на чале езуітаў стаяў генерал, які падпарадкоўваецца толькі Папе. Езуіт павінен быў беспярэчна падпарадкоўвацца старэйшым.

Перш за ўсё, езуітам удалося ў многіх краінах вярнуць частку пратэстантаў ва ўлонне Каталіцкага Касцёла. Гэта стала магчымым, дзякуючы ўменню вучняў Ігната наладжваць сувязі пры дварах еўрапейскіх дзяржаў і выкладання. Будучых езуітаў спецыяльна навучалі ў *іезуіцкіх калегіўмах* добрым манерам і асаблівай разнавіднасці пастырскай паблажлівасці. Пад выглядам студэнтаў, гандляроў або святароў яны пранікалі ў патрэбнае месца і паступова заваёўвалі папулярнасць як у народа, так і ў шляхты.

Па ўсёй Еўропе, а таксама на іншых кантынентах дзеці вучыліся ў езуітаў бясплатна (сродкі на выкладанне вылучаў ордэн). Іх добра кармілі, не перагружалі ўрокамі (не больш за 5 гадзін у дзень), прыдумлялі для іх спартыўныя гульні, так што многія людзі лічылі за шчасце аддаць сваё дзіця езуітам. Усяго праз некалькі месяцаў хлопчык парадуе бацькоў добрай латынню, а маці – выдатнымі манерамі і ўменнем трымаць сябе за сталом. Само выкладанне ў школах вялося па сярэднявечных і гуманістычных метадах: вывучалі погляды Тамаша Аквінскага, але пры гэтым была сістэма жорсткай канкурэнцыі паміж вучнямі.

## Тэма 4. Грамадска-культурная думка ў гады Контррэфармацыі (канец XVI – першая палова XVII ст.)

*Ключавыя паняцці:* Асветніцтва, кнігадрукаванне, “Псалтыр”, “Катэхізіс”, антытрынітарызм, унія.

**План лекцыі:** 1. Асветніцкі напрамак грамадска-палітычнай думкі беларускага Адраджэння. Погляды Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага.
2.Гістарычныя ўмовы развіцця грамадска-палітычнай думкі. Спецыфічныя рысы грамадска-палітычнай думкі XVII – першай паловы XVIII ст.

***Асветніцкі напрамак грамадска-палітычнай думкі беларускага Адраджэння. Погляды Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага.*** У барацьбе за свае палітычныя і эканамічныя правы супраць феадалаў і царквы буржуазія пачала выкарыстоўваць выпрацаваныя на Захадзе ў XIV–XVI стст. гуманістычныя і рэфармацыйныя ідэі. Найбольш яркім выразнікам інтарэсаў сярэдніх слаеў беларускіх гараджан, зацікаўленных у

развіцці буржуазных адносін стаў *Францыск Скарына* (1490-1551) – выдатны прадстаўнік нацыянальнай палітычнай і прававой думкі эпохі Адраджэння.

У 1517 г. Ф. Скарына пасяліўся ў Празе і распачаў актыўную выдавецкую дзейнасць. Ён перакладаў на старабеларускую мову і выдаў на працягу трох гадоў 23 кнігі Бібліі. Першая кніга Ф. Скарыны “Псалтыр” выйшла ў Празе 6 жніўня 1517 г. Гэтая дата лічыцца пачаткам беларускага кнігадрукавання.

Каля 1520 г. Ф. Скарына прыбыў у Вільню, ў якой беларускае насельніцтва складала абсалютную большасць, і тут у доме віленскага бургамістра Якуба Бабіча заснаваў друкарню. Каля 1522 г. Ф. Скарына выдаў “Малую падарожную кніжыцу”, а ў 1525 г. “Апостал”.

Бессмяротны подзвіг Ф. Скарыны – пераклад і выданне на тагачаснай беларускай мове Бібліі, якую ен разглядаў як сродак масавай асветы народу. Прадмовы і пасласлоўі Ф. Скарыны выдаваліся двойчы: у 1969 і 1990 гг. Для вывучэння светапогляду Ф. Скарыны можна карыстацца любым з гэтых выданняў. Калі будуць трапляцца неразумелыя словы, альбо цэлыя сказы, трэба звяртацца да “Слоўніка мовы Скарыны”.

Патрыятызм Ф. Скарыны ляжаў таксама ў аснове яго любві да роднай мовы, якая, як ён пісаў, праяўлялася “наіболей з тое прічіны, іже мя мілостівый бог с того языка на свет пустіл”.

Значнае месца ў прадмовах і пасласлоўя Ф. Скарна адводзіць палітычным і прававым праблемам. Для абазначэння дзяржавы Ф. Скарына ўжывае ў сваіх працах такія тэрміны, як “посполітое доброе”, “отчіна своя”, “собраніе людское” і іншыя. Яны павінны былі азначаць арганізацьцо насельніцтва, якое займае акрэсленую тэрыторыю падпарадкоўваеца адной і той жа ўладзе.

Мэтай дзяржавы з'яўляецца дасягненне ўсеагульнай карысці, магчыма лепшага жыцця. Палітычны ідэал Ф. Скарыны – асветная, гуманная і моцная манархія. Узорнымі правіцелямі ён лічыў Саламона, Пталамея Філадэльфа, Салона, Лікурга, Нуму Пампілія і іншых старажытнаўсходніх, старажытнагрэчаскіх і рымскіх цароў і заканадаўцаў. На яго думку, манарх павінен быць набожным, мудрым, адукаваным, чулым, справядлівым да сваіх падданых. Ен абавязаны кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі.

Аналіз асноўных грамадска-палітычных ідэй Ф. Скарыны сведчыць пра значны уклад, які ен зрабіў у беларускую палітычную навуку. Выкладаючы свае погляды, Ф. Скарына ўпершыню ўвеў у беларускую мову шэраг важных палітычных паняццяў і тым самым заклаў асновы беларускай грамадска-палітычнай лексікі.

Да ліку беларускіх гуманістаў XVI ст., побач з Ф. Скарынай, адносіца і *Мікола Гусоўскі* (каля 1480-1533), выдатны паэт-гуманіст эпохі Адраджэння.

Станаўленне светапогляду М. Гусоўскага, як і Ф. Скарыны, праходзіла ў непасрэдных зносінах з італьянскімі гуманістамі. З 1518 па 1523 гг. М. Гусоўскі знаходзіўся ў Рыме ў складзе беларуска-польскай дыпламатычнай місіі і меў магчымасць цесна сутыкацца з акружэннем рымскага напы Льва Х. Папа (яго свецкае імя Джаванні Медзічы, паходзіў з сям'і вядомага правіцеля Фларэнцыі Ларэнца Медзічы), быў прыхільнікам гуманістычных ідэй, вялікасвецкага ладу жыцця. Ён акружыў сябе вядомымі пісьменнікамі, скульптарамі, мастакамі, сярод якіх вядучае месца належала Рафаэлю Санці, аўтару бясмяротнай “Сіксцінскай мадонны”, а таксама вядомаму палітычнаму мысліцелю Н. Макіявелі. Льва Х наведвалі многія еўрапейскія славутасці, удзельнікі гуманістычнага руху, у прыватнасці, Эразм Ратэрдамскі. Гады папства Льва Х (1513-1521) адзначыліся пачаткам будаўніцтва шэрагу выдатных помнікаў – шэдэўраў архітэктурнага мастацтва, у тым ліку, сабору св. Пятра ў Рыме.

Мінавіта для папы Льва Х, гуманіста і заступніка мастацтваў, быў напісаны у Рыме галоўны твор М. Гусоўскага “Песня пра зубра” (поўная назва “Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго”). Твор быў выдадзены ў 1523 г. ў Кракаве на лацінскай мове і прысвячаўся каралеве Боне, італьянцы па паходжанні жонцы Жыгімонта І Старога. Самае вялікае адступленне ў паэме прысвечана княжанню Вітаўта (1392-1430). Яно займае прыкладна шостую частку твора. Зразумела, гэтая з'ява далека не выпадковая. Паэма стваралася ўтой час, калі ў палітычнай думцы еўрапейскага Адраджэння шырока абмяркоўвалася праблема ідэальнага манарха, характарыстыка ўласцівых яму рысаў, аб'ектыўных крытэрыяў яго палітычнай дзейнасці. Наколькі гэтая праблема была тады папулярнай, сведчыць выхад у свет (мінавіта у той час) прац такіх славутых мысліцеляў-гуманістаў як Т. Мор, А. Гевара, Н. Макіявелі і інш. Зразумела, найбольш папулярным і найбольш вядомым у той час у Італіі быў “Князь” ці “Гасудар” (Н. Макіявелі (1467-1527).

Апісваючы княжанне Вітаўта, М. Гусоўскі закранае ў сваім творы ўсе крытэрыі ацэнкі палітычнай дзейнасці ідэальнага манарха. Гэта ў першыю чаргу экспансіяніscцкая знешняя палітыка, пашырэнне межаў дзяржавы. У часы праўлення Вітаўта тэрыторыя ВКЛ дасягнула самых вялікіх памераў. У прыватнасці, на поўдні, адваяваўшы ў татар Паўдневую Падолію, ён пашырыў уладанні ВКЛ да чарнаморскага ўзбярэжжа. У 1415 г. Вітаўт урачыста на белам кані ўехаў у воды Чорнага мора, сімвалізіруючы гэтым актам устанаўлення тут сваёй улады. На ўсходзе межы княства распасціраліся да вярхоўяў Акі і Мажайска. На поўначы ен аказваў уплыў на палітыку Ноўгарада і Пскова. М. Гусоўскі з гонарам піша аб Вітаўце, які “сілу радзіме надаў, княства вялікім зрабіў”.

Але самыя вялікія беды нясуць жыхарам ВКЛ і Польшчы няспынныя агрэсійныя набегі з боку Крымскага ханства і Турцыі. М. Гусоўскі імкнецца прыцягнуць увагу папы да незлічоных пакут жыхароў ВКЛ ад жорсткіх набегаў татар і турак. Процістаянне агрэсіі патрабуе вялікіх ахвяр, звязана з каласальнымі стратамі. М. Гусоўскі падкрэслівае, што прымаючы ўдары з усходу на сябе, ВКЛ засланяе грудзямі хрысціянскія народы Еўропы. Твор М. Гусоўскага – гэта ўвабраны ў паэтычную форму палітычны трактат, у якім выказана адна з актуальнейшых палітычных ідэй таго часу – стварэнне лігі еўранейскіх хрысціянскіх дзяржаў, накіраванай супраць Турцыі, з мэтай абароны хрысціянскіх каштоунасцей, народаў. Ідэя сфармуляваная М. Гусоўскім (г.зн. праект стварэння кааліцыі хрысціянскіх еўрапейскіх дзяржаў, накіраванай супраць Турцыі) стала адной з цэнтральных у еўрапейскай палітычнай думцы XVI-XVII стст. і дамінавала ў ей да вырашальнай бітвы пад Венай (12 верасня 1683 г.), калі аб'яднаныя сілы еўрапейскіх дзяржаў пад началам Яна III Сабескага нагалаву разгромілі ўзброеныя сілы Турцыі, пасля чаго яна ўжо не думала аб інтэрвенцыі ў Еўропу. Як бачым, у “Песні пра зубра” М. Гусоўскі выступае як выразнік перадавых грамадска-палітычных ідэй свайго часу, што адлюстроўваюць карэнныя жыццёвыя інтарэсы не толькі народаў ВКЛ, але і ўсіх славянскіх народаў.

Такім чынам, можна сказаць, што М. Гусоўскі належаў да ліку тых палітычных мысліцеляў XVI ст., якія геніяльна ўгадалі тэндэнцыю развіцця чалавечага грамадства да ўсе большага супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі ў вырашэнні асобых, канкрэтных сацыяльна-палітычных праблем.

Найбольш вядомым тэарэтыкам правага крыла арыян (антытрынітарыяў) быў *Сымон Будны* (каля 1530-1593).

У 1560 г. віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны – адзін з магутнейшых абаронцаў кальвінізму ў Беларусі і Літве, накіраваў яго ў Клецк у якасці прапаведніка ў саборную царкву кальвінісцкага, або, як тады гаварылі, гельвецкага веравызнання, закладзеную там у 1552 г. У 1562 г. у Нясвіжскай друкарні заснаванай Мацеем Кавячынскім (каля 1520-1572), выйшаў у свет пратэстанцкі “Катэхізіс”, перакладзены С. Будным на беларускую мову. “Катэхізіс” С. Буднага ўяўляў з сябе падручнік для пачатковых пратэстансцкіх школ. Ён сведчыць пра тое, што беларускія пратэстанты зрабілі спробу стварыць сістэму пачатковай адукацыі на роднай беларускай мове. Да нас дайшло 10 экземпляраў гэтай кнігі.

У той жа час у Нясвіжы таксама на беларускай мове выйшаў самастойны твор С. Буднага кальвінісцкага зместу “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам”, прысвечаны Астафію Валовічу, які прымаў удзел у фінансаванні Нясвіжскай друкарні.

У сярэдзіне 60-х гадоў XVI ст. С. Будны парваў з кальвіністамі і далучыўся да больш радыкальнай плыні рэфармацыі – арыянства (антытрынітарызму). Ён вымушаны быў пераехаць у Лоск (цяпер Валожынскі раён Мінскай вобласці). У Лоску С. Будны ў поўную меру змог праявіць сябе і як перакладчык, і як пісьменнік, і як выдавец, і як глыбокі мысліцель-паленіст. Дзякуючы сваім вялікім ведам і палемічным здольнасцям ён хутка вылучыўся ў лік выдатных лідэраў антытрынітарызму.

Перш за ўсё С. Будны ўзяўся за пераклад Бібліі на польскую мову. Гэтая Біблія выйшла ў 1572 г., стаўшы прыкметнай з'явай у духоўным жыцці Рэчы Паспалітай. Потым С. Будны надрукаваў са сваёй прадмовай перакладзены ім на польскую мову Новы Запавет (1574). Нарэшце ў Лоску ў 1583 г. быў выдадзены галоўны твор С. Буднага "Пра свецкую ўладу", у якім гуманіст выказаў свае адносіны да сучасных яму дзяржавы і дзяржаўных устаноў, да воінскага абавязку шляхты, да прыватнай уласнасці, да права ўладання прыгоннымі і іншых актуальных грамадска-палітычных і прававых праблем таго часу.

Да ліку выдатных прадстаўнікоў беларускай грамадска-палітычнай думкі XVI ст. разам з С. Будным належыць і *Васіль Цяпінскі-Амельяновіч*. Ён паходзіў з Полацкай зямлі. В. Цяпінскі нарадзіўся каля 1540 г. у шляхецкай сям'і, якая валодала на Полаччыне радавым маёнткам Цяпіна (адсюль і яго прозвішча). Каля 1580 г. В. Цяпінскі ў радавым маёнтку Цяпіне стварыў на ўласныя сродкі друкарню, у якой выдаў "Евангелле" на беларускай мове са сваёй прадмовай, якая з'яўляецца найкаштоўнейшай крыніцай для характарыстыкі яго светапогляду. Гэта выдатны помнік грамадска-палітычнай думкі таго часу. У прадмове В. Цяпінскі (як і С. Будны) падвергнуў рэзкай крытыцы духавенства, якое не клапацілася пра развіццё навукі і асветы народа. Ён выказаўся за адкрыццё школ на беларускай мове.

В. Цяпінскі таксама быў прыхільнікам памяркоўнай плыні арыянства (антытрынітарызму), ідэйным натхніцелем якога з'яўляўся Сымон Будны. Светапогляд В. Цяпінскага прасякнуты гарачай, бязмежнай любоўю да радзімы, лёс якой ён, падобна Ф. Скарыне і С. Буднаму, гатовы падзяліць поўнасцю, без ваганняў.

***Гістарычныя ўмовы развіцця грамадска-палітычнай думкі. Спецыфічныя рысы грамадска-палітычнай думкі XVII – першай паловы XVIII ст.*** У XVII – першай палове XVIII ст. у сферы сацыяльна-эканамічных адносін адбываецца канчатковае афармленне саслоўнай структуры грамадства (замацаванне юрыдычнай адасобленасці асобных станаў); усталяванне фальварачна-паншчыннага тыпу сельскай гаспадаркі; агульнагаспадарчы

заняпад у выніку войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст., які прывёў да кансервацыі старых форм сацыяльна-эканамічнага ўкладу.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін адбываецца замацаванне прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі, аслабленне ролі цэнтральнай улады, умацаванне рэгіянальных палітычных цэнтраў (магнацкая алігархія), узмацненне палітычнай барацьбы паміж living магнацкімі групоўкамі. Шляхта як саслоўе канчаткова кансалідуецца, набыўшы значныя грамадзянскія і палітычныя прывілеі, і, дзякуючы ім, адасабляецца ад астатняга грамадства, утвараючы асобную супольнасць *"палітычнага народу шляхецкага"*, якая аб'яднала шляхту як ВКЛ, так і Польскага каралеўства.

*Спецыфічныя рысы грамадска-палітычнай думкі XVII – першай паловы XVIII ст.:*

1) Узмацненне ролі каталіцкай царквы, што адлюстроўваецца ў контррэфармацыйным руху, які знаходзіць шырокую падтрымку з боку дзяржавы. Адбываецца пераход пераважнай часткі шляхты ў каталіцызм. Адпаведна змяншаецца ўплыў пратэстанцкіх канфесій. У 1617 г. спыняецца дзейнасць антытрынітарыяў у ВКЛ (з 1662 г. іх дзейнасць афіцыйна забаронена ў Рэчы Паспалітай). У цеснай сувязі з развіццём контррэфармацыйнага руху адбываецца заключэнне Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г., якая прывяла да расколу праваслаўнай царквы і фактычнага з'яўлення новай уніяцкай канфесіі.

2) Нарастанне нецярпімасці і канфліктнасці ў міжканфесійных адносінах ВКЛ; частай з'явай становяцца гвалтоўныя дзеянні і пагромы ва ўзаемаадносінах паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Падтрымка контррэфармацыйнага руху з боку дзяржаўнай улады прывяла да абмежавання рэлігійнай талерантнасці ў Рэчы Паспалітай: дэпартацыя антытрынітарыяў за межы Рэчы Паспалітай паводле рашэнняў Сойма 1658 г.; забарона для рыма-католікаў і ўніятаў пераходу ў іншыя веравызнанні паводле рашэнняў Сойма 1668 г.; пазбаўленне некаталіцкай шляхты права займаць дзяржаўныя пасады, быць выбранымі ў парламенцкія і судовыя органы ўлады паводле рашэнняў соймаў 1717 і 1733 гг. Аднак захоўвалася юрыдычная правамоцнасць акту Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., якім гарантаваліся грамадзянскія правы некаталіцкай шляхты.

3) Развіццё адукацыі. Узнікненне вялікай сеткі канфесійных, у першую чаргу каталіцкіх, навучальных устаноў заходнееўрапейскага тыпу.

4) Клерыкалізацыя розных форм духоўнай культуры; аслабленне значэння свецкіх элементаў.

5) У розных формах духоўнай культуры пануючым стылем становіцца барока, для якога характэрна імкненне да пышнасці, пампезнасці.

6) Паланізацыя і лацінізацыя духоўнай культуры; паступовае аслабленне ролі старабеларускай мовы.

## Тэма 5. Палітычная і прававая думка ў перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі (сярэдзіна XVII – сярэдзіна XVIII стст.). Асветнікі і грамадска-палітычныя рэформы 70 -80 гг. XVIII ст. Грамадска-палітычная думка канца XVIII ст.

*Ключавыя паняцці*: клерыкальная ідэалогія, прыгоннае права, асветны абсалютызм, унія, рэлігійны фанатызм.

**План лекцыі:** 1. Грамадска-палітычная думка перыяду Контррэфармацыі і панавання клерыкальнай ідэалогіі ў грамадстве.
2. Дзейнасць І. Кунцэвіча. Сацыяльна-філасофскія погляды К. Лышчынскага. С. Полацкі – тэарэтык асветнага абсалютызму ў Расіі. Грамадска-палітычныя погляды І. Капіевіча, А. Філіповіча.

***Грамадска-палітычная думка перыяду Контррэфармацыі і панавання клерыкальнай ідэалогіі ў грамадстве.*** З сярэдзіны XVII ст. ў эканамічным і палітычным жыцці Рэчы Паспалітай пачалі рэзка праяўляцца крызісныя працэсы, якія абазначыліся ўжо на пачатку стагоддзя. Эканамічны заняпад перажывалі гарады, рамёствы, гандаль, а таксама сельская гаспадарка. Узмацнялі крызісныя з'явы шматгадовыя войны, якія дзяржава амаль безупынна вяла з 1648 па 1717 г. У выніку “крывавага патопу” (так сучаснікі называлі ваенныя дзеянні сярэдзіны XVII ст., якія знайшлі мастацкае адлюстраванне ў вядомай трылогіі Генрыха Сенкевіча “Агнем і мячом”, “Патоп” і “Пан Валадыёўскі”) большая частка тэрыторыі Беларусі прыйшла ў заняпад.

Эканамічны заняпад суправаджаўся палітнычнай анархіяй. Каралеўская ўлада была слабай. Дзяржава заставалася практычна без войска. Любыя праекты стварэння рэгулярнай арміі бсзагаворачна адхіляліся большасцю магнатаў і шляхтай, якія хацелі заставацца адзінай узброенай сілай у краіне і карыстацца звязанымі з гэтым прывілеямі. З другой паловы XVII ст. ў палітычным жыцці краіны аслабла значэнне сойма. Да сярэдзіны XVII ст. законы на соймах прымаліся большасцю галасоў, аднак з 1652 г. ў соймавай практыцы стаў ужывацца сумна вядомы прынцып liberum veta. Дастаткова было хаця б аднаму паслу (дэпутату) сойма выступіць супраць законапраекту і ен адхіляўся. Па сутнасці сойм спыніў сваю законатворчую дзеннасць.

Пераважная большасць яго паседжанняў зрывалася. Пры гэтым пасол, які выкарыстаў права не быў абавязаны тлумачыць свае дзеянні. Гэты прынцып выдатныя палітычны мысліцелі наступных стагоддзяў называлі «забойчым для далейшага развіцця Рэчы Паспалітай», таму заканамерна, што ў праграмах рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітй, распрацаваных выдатнымі прадстаўнікамі асветніцкай думкі XVIII ст., адным з першых патрабаванняў была ліквідацыя гэтага прынцыпа.

Паколькі роля агульнадзяржаўных соймаў знізілася, рэальная ўлада на месцах перайшла да шляхецкіх соймікаў, у якіх рашаючы ўплыў належаў магнатам. Гэта прывяло да яшчэ большай дэцэнтралізацыі. Дайшло да таго, што Рэч Паспалітая пачала распадацца на шэраг самастойных рэгіёнаў, якія дзейнічалі паасобку, разрознена і запаўнялі ўнутрыпалітычнае жыцце дзяржавы міжусобнай грызнёй і сутыкненнямі.

Заняпад у галіне эканомікі і палітыкі суправаджаўся рэгрэсам у духоўным жыцці, што было звязана з канчатковай перамогай Контррэфармацыі, дамінуючай роляй у дзяржаве каталіцкай царквы, ордэна езуітаў.

У гэты перыяд латынь зноў вярнула сабе страчаныя пазіцыі і стала мовай навучання і набажэнства.

Такім чынам, другая палова XVII – першая палова XVIII ст. для Беларусі – адзін з самых змрочных і цяжкіх перыядаў яе гісторыі. Ён характарызуецца кніжнай бясплённай навуковасцю, сляпым абгрунтаваннем дагматаў веры, бяздумным педантызмам, пераследам іншадумцаў.

Але падавіць вольную думку ў Беларусі царкоўнікам не ўдалося. Нягледзячы на засілле рэлігійнага фанатызму і схаластыкі, у беларускай грамадска-палітычнай думцы не адбылося разрыву з гуманістычнымі традыцыямі Адраджэння і Рэфармацыі.

Прадстаўнікі грамадска-палітычнай думкі гэтага перыяду нават у жорсткіх умовах няроўнага супрацьстаяння з каталіцкай ідэалогіяй, абапіраючыся на прагрэсіўныя дасягненні айчыннай і замежнай палітычнай навукі, узнімалі і творча развівалі арыгінальныя грамадска-палітычныя ідэі.

***Дзейнасць І. Кунцэвіча. Сацыяльна-філасофскія погляды К. Лышчынскага. С. Полацкі – тэарэтык асветнага абсалютызму ў Расіі. Грамадска-палітычныя погляды І. Капіевіча, А. Філіповіча.*** *Іязафат Кунцэвіч* (1580-1623) – уніяцкі біскуп, архіепіскап Полацкі, актыўны прыхільнік Брэсцкай уніі 1596 г. І. Кунцэвіч аднаўляў храмы (у тым ліку Сафійскі сабор), засноўваў царкоўна-прыходскія школы. Яго дзейнасць выклікала варожыя дзеянні праваслаўных іерархаў, якія жадалі кансалідацыі з Масквой, а не з Рымам. У 1623 г. падчас пастырскага візіту ў Віцебск І. Кунцэвіч быў забіты.

Адным з тых, хто ў гэты перыяд непадзельнага панавання ідэалогіі каталіцызму, рэлігійнага фанатызму і схаластыкі мужна выступіў з арыгінальнымі палітыка-прававымі ідэямі быў *Казімір Лышчынскі* – выразнік інтарэсаў радыкальных слаеў гараджан і прагрэсіўнай інтэлігенцыі таго часу, адзін з першых прадстаўнікоў утапічнага сацыялізму ў Беларусі. К. Лышчынскі нарадзіўся 4 сакавіка 1634 г. ў маёнтку Лышчыцы Брэсцкага павета ў шляхецкай сям’і. Першапачатковую адукацыю Казімір атрымаў у Брэсце, потым працягваў яе ў Віленскай езуіцкай акадэміі, а закончыў ў адным з заходнееўрапейскіх універсітэтаў, глыбока засвоіўшы лепшыя дасягненні навукі і філасофіі таго перыяду.

Пад уплывам бацькоў Казімір уступіў у ордэн езуітаў і некалькі год настаўнічаў у адным з калегіўмаў на тэрыторыі Беларусі. Пазней, пераканаўшыся ў поўнай нікчэмнасці схаластычнай псеўданавукі, ен пакідае выкладчыцкую працу і вырашае заняцца юрыдычнай практыкай. Глыбокі знаўца старажытных і новых моў, чалавек надзвычайнай эрудыцыі, ён цалкам аддаваў увесь свой вольны час навуковай працы. І чым глыбей вывучаў ён прагрэсіўную спадчыну, тым больш прераканаўчымі былі яго думкі, погляды на навакольны свет.

Вынікі сваіх даследаванняў ён выклаў у працы “Аб неіснаванні бога”. Гэты твор – вынік шматгадовых разважанняў і даследаванняў вучонага – быу напісаны на лацінскай мове. Даведаўшыся, што вучоны працуе над пісьмовым выкладаннем сваіх поглядаў, члены “Таварыства Ісуса” зрабілі спробу ўкрасці напісанае К. Лышчынскім. І гэтая спроба ім удалася. У 1687 г. сусед Лышчынскага Ян Бжоска, які спадзяваўся на значную матэрыяльную ўзнагароду, украў у мысліцеля яго рукапіс і пераслаў віленскаму епіскапу Бжастоўскаму. Той, у сваю чаргу, убачыўшы ў творы філосафа, як і меркавалася, “радыкальныя думкі», загадаў арыштавць К. Лышчынскага і пасадзіць у віленскую турму.

К. Лышчынскі быў рашучым праціўнікам існуючага феадальнага ладу і яго інстытутаў, ставіў пытанне аб яго ліквідацыі, замене новай сацыяльна-палітычнай сістэмай. Трактат К. Лышчынскага да нас не дайшоў, ен быў спалены, разам з аўтарам. К. Лышчынскага можна разглядаць як аднаго з першых прадстаўнікоў утапічнага сацыялізму на Беларусі.

Атмасфера рэлігійнага фанатызму, варожасці і нецярпімасці да праяў свабоднай грамадскай думкі змушала творчыя асобы пакідаць радзіму, шукаць прытулку ў другіх краінах, дзе былі больш спрыяльныя ўмовы для творчасці. Сярод тых, хто пакінуў Беларусь у гэты перыяд, быў С. Полацкі.

*Сімяон Полацкі* нарадзіўся ў снежні 1629 г. у Полацку. Тут жа атрымаў першапачатковую адукацыю. У далейшым вучыўся ў Кіева-Магілянскай калегіі

і езуіцкай акадэміі ў Вільні. У 1656 г. прыняў манаства і пачаў выкладаць у брацкай школе пры Полацкім Богаяўленскім манастыры, усімі сіламі імкнучыся пераадолець вузкія рамкі педагогікі таго часу. С. Полацкі пашырыў кола прадметаў для вывучэння, арганізаваў тэатр, п’есы для якога пісаў сам. У яго творах знаходзілі адлюстраванне найбольш злабадзённыя праблемы грамадска-палітычнага жыцця таго часу.

У 1664 г. па запрашэнні цара Аляксея Міхайлавіча вучоны перасяліўся ў Маскву, дзе разгарнуў актыўную асветніцкую дзейнасць. Яна мела вялікае значэнне для развіцця прагрэсіўнай культуры рускага, беларускага і ўкраінскага народаў. У Маскве ен вучыў лацінскай мове падзячых Прыказа тайных спраў, якія рыхтаваліся для дзяржаўнай і дыпламатычнай службы. Адначасова займаўся выхаваннем царскіх дзяцей, сярод якіх быў будучы імператар Расіі – Петр І. Незадоўга да смерці па даручэнні цара Фёдара Аляксеевіча С. Полацкі склаў статут акадэміі – першай вышэйшай навучальнай установы Расіі, якую меркавалася адкрыць у Маскве. Гэтая ідэя мысліцеля была ажыццёўлена ў 1687 г., з адкрыццём Славяна-грэка-лацінскай акадэміі, у якой атрымаў адукацыю М.В. Ламаносаў.

Вялікую актыўнасць праявіў ён і як выдавец кніг, прадоўжыўшы тым самым выдавецкія традыцыі свайго слаўнага земляка Ф. Скарыны. У 1678 г. у Крамлі пад яго кіраўніцтвам пачала дзеннічаць друкарня, перавезеная ў Расію з Оршы, у якой беларускі вучоны надрукаваў шэраг кніг асветніцкага характару. Праз дзесяць гадоў пасля выдання “Псалтыр рыфматворны” быу пакладзены на музыку рускім кампазітарам Васілём Цітовым (1650–1710).

У Маскве плённа развівалася шматбаковая літаратурная творчасць С. Полацкага. Менавіта тут ім былі напісаны філасофскія і багаслоўскія трактаты, пропаведзі, гутаркі, настаўленні, драмы, камедыі, а таксама мноства вершаў, з якіх потым ён склаў два манументальныя зборнікі: “Вертаград мнагацветны” (1668) і “Рыфмалагіён” (1679). Гэта былі першыя паэтычныя зборнікі ў Расіі.

С. Полацкі выступае як мысліцель, палітык, асветнік і педагог, які на ўсе грамадскія з'явы глядзіць з пункту гледжання перспектыўных дзяржаўных інтарэсаў. С. Полацкі – адзін з першых прыхільнікаў і праваднікоў *ідэалогіі асветнага абсалютызму* ў Расіі. У гісторыі рускай палітычнай і прававой думкі ён адным з першых даў найбольш змястоўнае тэарэтычнае абгрунтаванне неабходнасці ўстанаўлення ў Рассіі асветнай манархіі, як формы дзяржаўнага кіравання.

*Ілля Капіевіч* (1651–1714) вучыўся ў кальвінісцкай школе ў Слуцку. У выніку трагічных акалічнасцяў быў вывезены ў Расію. Калі вярнуўся на радзіму, яго абвінавацілі ў здрадзе каралю Рэчы Паспалітай. Малады чалавек

вымушаны быў эміграваць на Захад. З сярэдзіны 1660-х гг. ён жыў у Галандыі, стаў усебакова адукаваным чалавекам. І. Капіевіч дасканала валодаў лацінскай, нямецкай, галандскай, польскай, рускай мовамі. У Амстэрдаме ў 1097–1698 гг. ён пазнаёміўся з рускім царом Пятром І, стаў прыхільнікам яго сацыяльна-палітычных і эканамічных рэформ. Па жаданню Пятра І Капіевіч часткова пераклаў, а часткова склаў самастойна і выдаў каля 20 кніжак (пераважна вучэбнага характару) на рускай мове. Гэта былі кнігі па гісторыі, арыфметыцы, вайсковай і марской справах, лацінскія і рускія граматыкі, руска-лацінска-нямецкія слоўнікі і г.д. Заказаныя Пятром І кнігі Капіевіч выдаваў спачатку ў Амстэрдаме, а потым у Берліне і Капенгагене. Актыўная выдавецкая дзейнасць І. Капіевіча была заснавана на перакананні неабходнасці асветы грамадства і перш за ўсе распаўсюджванні асветы сярод славянскіх народаў, пашырэнні сярод іх навуковых ведаў. Ен шчыра спадзяваўся, што яго друкаваная кніга “разжет сердце ко совершенному вразумению и  познанию сего света”. Вялікае значэнне надаваў І. Капіевіч вывучэнню палітычнай і грамадзянскай гісторыі. Ён лічыў, што яна прыносіць карысць як ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі, так і ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі. Як прыхільнік карэнных пятроўскіх пераўтварэнняў, якія ламалі старыя формы грамадска-палітычнага жыцця, ён вітаў умацаванне дзяржаўнага ладу Расіі.

*Афанасій Філіповіч* (1597–1648) – вядомы беларускі грамадскі і царкоўна-палітычны дзеяч першай паловы XVII ст. Нарадзіўся ён на Брэстчыне ў сям'і рамесніка, атрымаў добрую на той час адукацыю, працаваў настаўнікам. З 1620 г. знаходзіўся пры двары канцлера ВКЛ Льва Сапегі. У 1627 г. Філіповіч пастрыгся ў манахі пры віленскім Святадухаўскім манастыры і распачаў рэлігійна-асветніцкую дзейнасць. Ён – аўтар “Дыярыўша” (“Дзённіка”, 1646), у якім змешчаны яго галоўныя палітычныя думкі.

У барацьбе супраць уніі Філіповіч, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў – праваслаўных палемістаў, не закранаў спрэчных пытанняў царкоўна-дагматычнага багаслоўя. Магчыма, што гэтым тонкасцям у рэлігійна-палітычнай барацьбе ён не надаваў асабліва вялікага значэння. Свае намаганні Філіповіч сканцэнтраваў на крытыцы каталіцкай і ўніяцкай царкваў, палітыкі правячых колаў Рэчы Паспалітай. Ён лічыў, што ўвядзенне царкоўнай уніі і яе існаванне не могуць быць вытлумачаны ні царкоўна-рэлігійнымі, ні грамадска-палітычнымі, ні нават дзяржаўнымі інтарэсамі Рэчы Паспалітай. Унія павінна быць скасавана дзеля будучыні самой дзяржавы.

Свае надзеі на ліквідацыю ўніі Філіповіч ускладаў на караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV (кіраваў з 1632 па 1648) – сына Жыгімонта III Вазы. У сувязі з гэтым Філіповіч разважаў над праблемамі арганізацыі дзяржаўнай улады. Ён – прыхільнік абсалютнай манархіі.

Кароль у яго разуменні павінен быць галавой як заканадаўчай, так і выканаўчай улады. Дзейнасць Сената і духоўнай улады абмяжоўваецца дарадчымі функцыямі. Яны павінны выконваць волю караля, забяспечваць пры дапамозе дзяржаўнага апарату рэалізацыю яго рашэнняў. Падобная структура ўлады, на думку Філіповіча, пакладзе канец як шляхецкай анархіі і свавольству, так і дапаможа рацыянальна арганізаваць грамадскае жыццё.

А. Філіповіч – прыхільнік ідэі адзінства славянскіх народаў. У 1637 –1638 гг. ён ездзіў ў Маскву да рускага цара, прасіў яго выступіць у абарону правоў праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны.

Жыццё яго абарвалася нечакана. У 1648 г. за тайныя зносіны з казакамі Багдана Хмяльніцкага ён быў расстраляны брэсцкім ваяводам Масальскім. Праваслаўная царква кананізавала Афанасія Філіповіча, прылічыўшы яго да ліку святых.

## Тэма 6. Грамадска-палітычная думка ў першай палове XIX ст. Грамадска – палітычны рух у Беларусі ў другой палове XIX ст.

*Ключавыя паняцці:* масоны, “Патрыятычнае таварыства”, нацыянальная літаратурная мова, пачатк беларускага нацыянальнага адраджэння.

**План лекцыі:** 1.Спецыфіка развіцця грамадска-палітычнай думкі ў пачатку XIX ст.

2. Віленскі ўніверсітэт як цэнтр вольнадумства. Першыя праяўленні беларускай нацыянальнай ідэі ў мастацкай літаратуры. Развіццё навуковых ведаў аб беларускім народзе.

3. Рост грамадзянскай свядомасці. Тайныя таварыствы і арганізацыі. Філарэты. Філаматы. Т. Зан, А. Міцкевіч, Я. Чачот.

***Спецыфіка развіцця грамадска-палітычнай думкі ў пачатку XIX ст.*** На пачатку XIX ст. грамадска-палітычная сітуацыя на Беларусі шмат у чым вызначалася падзеямі агульнаеўрапейскага маштабу: французскай буржуазнай рэвалюцыяй (1789-1794), падзеламі Рэчы Паспалітай, вайной 1812 г. і г.д.

Французская буржуазная рэвалюцыя садзейнічала распаўсюджванню рэвалюцыйных і дэмакратычных ідэй, спрыяла актывізацыі радыкальна-дэмакратычных рухаў у еўрапейскіх краінах. Адначасова яна выклікала рэзкае супрацьдзеянне правячых колаў большасці еўрапейскіх краін. Апошнія

імкнуцца кансалідавацца, каб стварыць перешкоду распаўсюджванню рэвалюцыйных ідэй і рэальных рэвалюцыйных здзяйсненняў.

Практычна ва ўсіх еўрапейскіх краінах назіраюцца рэвалюцыйныя ўзрушанні. Для значнай часткі беларускай шляхты – адзінага правадзейнага суб'екта тагачаснага грамадства, прычынай незадаволенасці былі падзелы Рэчы Паспалітай, імкненне да яе рэстаўрацыі. Побач з гэтым, у дэмакратычна-радыкальных колах выспяваюць ідэі аб неабходнасці вызвалення сялян ад прыгоннага стану, дэмакратычных пераўтварэняў у грамадстве.

Ва ўмовах абсалютысцкай Расійскай імперыі легальным асяродкам, дзе маглі праяўляцца апазіцыйныя настроі былі губернскія і павятовыя шляхецкія дэпутацкія сходы, якія мясцовае дваранства разглядала як былыя сеймікі Рэчы Паспалітай. Гэта становішча вызывала рэзкае супрацьдзеянне мясцовай расійскай адміністрацыі.

Вайна 1812 г. паміж Расіяй і Францыяй, яе вынікі, стварэнне ў 1815 г. Царства Польскага не спраўдзілі надзей пэўнай часткі шляхецтва на аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Не дзіўна, што пры такой сітуацыі на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай узнікаюць разнастайныя суполкі, якія дзейнічаюць у гэтым накірунку.

*Масоны* – рэлігійна-маральны рух, які ўзнік на пачатку XVIII ст. у Англіі. Пад гэтым вызначэннем хаваюцца рухі разнастайнай накіраванасці, у тым ліку рэвалюцыйнай. Масонскія арганізацыі ў пачатку XIX ст. існавалі ў большасці еўрапейскіх краін і не выклікалі, пераважна, актыўнага супрацьдзеяння з боку ўлад, даволі часта ў склад масонскіх ложаў уваходзілі ўплывовыя асобы.

На тэрыторыі Царства Польскага суполкі масонаў аднаўляюць сваю дзейнасць у 1814 г. Расійскія ўлады ведалі аб іх існаванні і не мелі нічога супраць. Гэтыя арганізацыі звязвалі свае надзеі на ўваскрашэнне вялікай Польшчы з расійскім імператарам у якасці польскага караля. З цягам часу сярод польскіх масонаў узнікаюць радыкальныя плыні, для якіх справа рэстаўрацыі Рэчы Паспалітай робіцца чыста нацыянальнай польскай справай, дзе ўжо няма месца Аляксандру I і Расіі. Як вынік – у 1822 г. абвешчаны агульнаімперскі ўказ, забараняўшы дзейнасць масонскіх лож.

З польскімі масонскімі арганізацыямі цесна звязана дзейнасць масонаў на Беларусі і Літве. У 1819 г. у Вільні ўзнікае адгалінаванне польскага “Нацыянальнага масонства”. У 1820 г. “Нацыянальнае масонства” фармальна прыпыняе свае існаванне, але пры гэтым многія яго члены ўваходзяць у зноў створанае “Патрыятычнае таварыства” (1821 г.), і мясцовае віленскае аддзяленне “Нацыянальнага масонства” трансфармуецца ў правінцыйны савет “Патрыятычнага таварыства” (старшыня – М. Ромер, члены: К. Радзівіл, Я. Вайніловіч, К. Навамейскі, А. Солтан). Літоўская ложа колькасна

пашыраецца. Цераз Т. Зана масоны ўсталёўваюць сувязь з мясцовымі тайнымі арганізацыямі студэнцкай і вучнёўскай моладзю. На тэрыторыі Беларусі і Літвы існуе ў гэты час шэраг мясцовых нешматлікіх ложаў у Мінску, Несвіжы, Навагрудку, Гродне.

***Віленскі ўніверсітэт як цэнтр вольнадумства. Першыя праяўленні беларускай нацыянальнай ідэі ў мастацкай літаратуры. Развіццё навуковых ведаў аб беларускім народзе.*** Да пачатку XIX ст. на беларускіх землях, далучаных да Расійскай імперыі, захоўвалася старая сістэма навучання – школы пры розных рэлігійных арганізацыях і навучальныя ўстановы былой Адукацыйнай камісіі. У выніку праведзенай ў Расіі ў 1802 г. рэформы адукацыі Беларусь увайшла ў Віленскую навучальную акругу, цэнтрам якой стаў адкрыты ў 1803 г. на базе Галоўнай Літоўскай школы *Віленскі універсітэт.* За кароткі час ён стаў буйнейшай у Расіі вышэйшай навучальнай установай.

У структуру ўніверсітэта ўваходзілі 4 факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, факультэт маральных і палітычных навук і факультэт літаратуры і вольных мастацтваў. Першымі рэктарамі і арганізатарамі ўніверсітэта былі Еранім Страйноўскі (1799-1806) і Ян Снядэцкі (1807-1814) і інш. Пры ўніверсітэце былі адкрыты медыцынскі, ветэрынарны, агранамічны інстытуты, астранамічная абсерваторыя, першы ў Расіі заалагічны музей, адзін з самых багатых у Еўропе батанічных садоў. У 1830-м г. ва ўніверсітэце навучаліся 1300 студэнтаў, 40% з якіх былі выхадцы з Беларусі.

Кіраўніцтву ўніверсітэта падпарадкоўваліся сярэднія навучальныя ўстановы – гімназіі. У сваю чаргу, дырэкцыі гімназій кіравалі дзейнасцю павятовых вучылішчаў. Павятовым вучэльнях падпарадкоўваліся парафіяльныя вучылішчы. Гэтая сістэма адукацыі грунтавалася на прынцыпах пераемнасці, усесаслоўнасці і свецкасці.

Асаблівасцю развіцця культуры Беларусі першай паловы XIX ст. быў працэс яе паланізацыі, найбольш відавочны ў першай трэці стагоддзя. Гэта было абумоўлена палітыкай Аляксандра I, якая была накіравана на аднаўленне польскай дзяржаўнасці, і знайшла падтрымку ў асяроддзі польскіх магнатаў і паланізаванага беларускага шляхецтва. Цэнтрам польскага ўплыву была Вільня з яе ўніверсітэтам. Працэс паланізацыі некалькі паменьшыўся, але не спыніўся пры Мікалаі I, які праводзіў адначасова палітыку русіфікацыі Беларусі.

Развіццё *нацыянальнай літаратурнай мовы*, агульнай для ўсёй этнічнай тэрыторыі, патрабуе ад прыгнечаных народаў, у першую чаргу, іх інтэлігенцыі, працяглай барацьбы за пашырэнне яе ўжывання ва ўсіх сферах культурнага, гаспадарчага, грамадскага і дзяржаўна-палітычнага жыцця. Канчаткова гэтыя праблемы вырашаюцца толькі з заваёвай прыгнечаным народам дзяржаўнай незалежнасці. Новая беларуская літаратурная мова стала фарміравацца ў

першай палове XIX ст. на падставе жывой, шмат дыялектнай народнай мовы. У гэты час умовы для развіцця беларускай мовы не былі спрыяльнымі, паколькі асноўныя функцыі ў ролі дзяржаўнай мовы выконвала руская мова. Нягледзячы на гэта, у першай палове XIX ст. ўпершыню паўстала пытанне аб самастойнай беларускай мове, што з'явілася адным з фактараў фарміравання беларускай этнічнай самасвядомасці. Старабеларуская мова да гэтага часу захоўвалася толькі ў вуснай форме, выкарыстоўвалася ў асноўным у сялянскім асяроддзі, а таксама часткова гарадскім насельніцтвам і збяднелай шляхтай.

Ля вытокаў *беларускай літаратурнай мовы* стаялі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі. Нягледзячы на тое, што яны лічылі сябе этнічнымі палякамі, яны цікавіліся культурай і мовай простага насельніцтва, якое жыло на беларускіх землях.

У 1840-я гады ў культуры Беларусі праявіўся пераход ад рамантызму да рэалізму. Аб гэтым сведчыць творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Першымі творамі пісьменніка сталі лібрэта аперэт “Рэкруцкі яўрэйскі набор» “Спаборніцтва музыкаў”, “Чароўная вада”. П’есы, напісаны на польскай мове і пастаўлены на мінскай сцэне. У 1846 г. убачыла свет музычная п’еса В.Дуніна-Марцінкевіча “Сялянка” (“Ідылія”), у якой упершыню загучала жывая беларуская мова. У 1850-я гг. пісьменнік стварае вершаваныя расказы “Вечарніцы” і “Гапон”, “Халімон на каранацыі”, займаецца перакладамі. На пачатку 1860-х гадоў ён стварае свой лепшы твор – фарс-вадэвіль “Пінская шляхта”.

Ян Чачот, Аляксандр Рыпінскі, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і многія іншыя ўраджэнцы Беларусі пісалі не толькі на польскай, але і на мясцовай мове, за якой яшчэ ў першай палове XIX ст. замацавалася назва “беларуская”, хоць, да прыкладу, Ян Чачот лічыў, што піша на “славяна-крывіцкай мове”, а Рыпинскі называў яе дыялектам польскай мовы.

Менавіта ў першай палове XIX ст. у свядомасці шляхты беларускіх зямель, якая называла сябе “ліцвінскай”, пачалі адбывацца велізарныя па сваёй значнасці зрухі, якія леглі ў аснову працэсу, які мы сёння называем *пачаткам беларускага нацыянальнага адраджэння*. Шляхта мясцовага паходжання вывучала гісторыю роднага краю, народную культуру, да якіх пачала ставіцца як да ўласных каранёў і здабыткаў. Выдзеліліся беларуская археалогія, этнаграфія, фалькларыстыка, дзе плённа працавалі І. Грыгаровіч, Т. Нарбут, браты Я. і К. Тышкевічы, Я. Чачот, А. Кіркор. Выяўляюцца і публікуюцца шматлікія матэрыялы і дакументы з беларускай мінуўшчыны, пішуцца абагульняючыя аналітычныя працы, складаюцца фальклорныя зборнікі. З ініцыятывы Яўстафія Тышкевіча ў 1855 г. быў заснаваны першы публічны ў Беларусі і Літве Віленскі музей старажытнасцей. Пры ім дзейнічала

археалагічная камісія, якая займалася зборам, даследаваннем і папулярызацыяй гістарычнай і этнакультурнай спадчыны, арганізоўвала абмен інфармацыяй, кнігамі і сустрэчы з навуковымі арганізацыямі Англіі, Даніі, Расіі, Францыі, Швейцарыі, Швецыі і іншых краін. У пачатку 40-х гг. знакаміты чэшскі вучоны Павел Шафарык на этнаграфічнай карце Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ўпершыню паказаў этнічную тэрыторыю беларусаў; ён жа адзначыў 15 спецыфічных асаблівасцей беларускай мовы. Усё гэта сведчыла аб пачатку самапазнавання народа і яго сцвярджэння ў новай еўрапейскай і славянскай сям'і.

К сярэдзіне XIX ст. завяршыўся адзін з вялікіх этапаў у гісторыі беларускай культуры. У цяжкіх умовах, калі ўплывала польская культура і пачаўся працэс русіфікацыі, ішоў працэс фарміравання і развіцця нацыянальнай культуры. Перш за ўсё ён вызначыўся ў станаўленні сучаснай беларускай мовы, новай беларускай літаратуры, асэнсаванні гістарычнага шляху, які прайшоў народ.

Разам з тым к канцу прыгоннай эпохі ў грамадска-культурным жыцці народа Беларусі выразна праявілася неадпаведнасць паміж дасягнутым узроўнем духоўнай культуры і авалоданнем культурнымі каштоўнасцямі. У грамадстве былі абмежаваны магчымасці для распаўсюджвання асветы і народнай адукацыі. Гэта сведчыла аб крызісе ў духоўным жыцці беларускага народа. Феадальны строй уступаў у супярэчнасць не толькі з сацыяльна-эканамічным, але і з грамадска-культурным прагрэсам.

## Тэма 7. Грамадская думка і палітычныя плыні ў пачатку XX ст. Фарміраванне беларускай нацыі

*Ключавыя паняцці:* стачкі, эканамізм, Бунд, РСДРП, бальшавікі, меньшавікі, ППС на Літве, сацыялісты-рэвалюцыянеры, БСГ, паліцэйскі сацыялізм, зубатаўшчына, сіянізм, Дзяржаўная Дума, курлоўскі расстрэл, Маніфест аб свабодах, кадэты, акцябрысты, чэрвеньскі дзяржаўны пераварот, земская рэформа, “Наша Ніва”, аграрнае пытанне, Сталыпінская рэформа, Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

**План лекцыі:** 1.Дзейнасць палітычных партый і рухаў (БУНД, РСДРП, ПСР, БСГ і інш.).

2.Праблема гістарычнага выбару пасля падзення ў Расіі самадзяржаўя.

Сусветны эканамічны крызіс, які паралізаваў гаспадарчую дзейнасць у Расійскай імперыі, аднолькава цяжка адбіўся і на беларускай прамысловасці, што ў сваю чаргу значна погоршыла матэрыяльнае сановішча беларускага пралетарыята. Зачыняліся прадпрыемствы, зніжаліся памеры заробкаў, пагаршаліся ўмовы працы. Спробы пратэстаў заканчваліся масавымі звальненнямі. Цяжкім выпрабаваннем для беларускага пралетарыяту стала беспрацоўе, з прычыны таго, што асабліва пацярпелі ад крызісу дробныя капіталістычныя і рамесніцкія прадпрыемствы, якія пераважалі на Беларусі.

***Дзейнасць палітычных партый і рухаў (БУНД, РСДРП, ПСР, БСГ і інш.).*** *Стачкі* і іншыя мерапрыемствы пратэсту мелі вынікам узмацненне рэпрэсій супраць пратэстуючых. У гэтых умовах, прасякнутых безысходнасцю, адбываўся хуткі працэс палітызацыі рабочага руху. Да пачатку XX ст. ўтварыліся галоўныя палітычныя партыі сацыялістычнага накірунку, якія дзейнічалі падпольна, ва ўмовах пастаянных рэпрэсій з боку ўрада. У сацыял-дэмакратычным лагеры існавала дзве плыні – рэфармісцкая, якая стаяла на ідэях эканамізму, распрацаванага нямецкім сацыял-дэмакратам Бернштэйнам і рэвалюцыйная, якую ідэйна абгрунтавалі Г. Пляханаў і У. Ульянаў (група Іскры). *Эканамізм* прадугледжваў абмежаванне барацьбы толькі пытаннямі эканамічнага і сацыяльнага кшталту, а рэвалюцыянеры дамагаліся звяржэння самадзяржаўя.

Палітычная растаноўка сіл на Беларусі была досыць неаднолькавай і складанай. Вядучай палітычнай сілай быў Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз Расіі і Польшчы – *Бунд*, які прытрымліваўся пазіцый эканамізму. Бунд так сама ўваходзіў у *РСДРП* на правах аўтаномнай арганізацыі. Але дзейнічалі бундаўцы пераважна асобна, яны падпарадкавалі сабе ўсе мясцовыя арганізацыі РСДРП на Беларусі і ў 1901 г. на IV з’ездзе аб’явілі сябе адзінай арганізацыяй, якая абараняе інтарэсы яўрэйскага насельніцтва. Бунд патрабаваў пераўтварыць РСДРП у федэрацыю нацыянальных сацыял-дэмакратычных партый. На другім з’ездзе РСДРП, які адбыўся за мяжой у 1903 г. Бунд не атрымаўшы падтрымкі дэлегатаў, пакінуў з’езд, а астатняя частка дэлегатаў падзялілася на *бальшавікоў* – прыхільнікаў пралетарскай рэвалюцыі і жорсткай партыйнай дысцыпліны і *меньшавікоў* – больш памяркоўных у пытаннях партыйнага будаўніцтва.

У 1903-1904 гг. *Расійская сацыял-дэмакратычная партыя (РСДРП)* пачала ствараць сетку мясцовых арганізацый на Беларусі. Яны хутка з’явіліся ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Барысаве і іншых буйнейшых гарадах. На працягу студзеня-сакавіка 1904 г. былі створаны Палескі камітэт РСДРП, якому падпарадкаваліся арганізацыі поўдня Беларусі і Паўночна-Заходні камітэт, які кіраваў астатнімі арганізацыямі РСДРП на Беларусі. На блізкіх да РСДРП пазіцыях стаяла партыя *Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы*

*(*СДКПіЛ*)*, якая была створана ў 1900 г. Кіравалі партыяй Ф. Дзяржынскі і С. Трусевіч. Партыя выступала за звяржэнне самадзяржаўя ў саюзе з іншымі сацыялістычнымі партыямі, таму СДКПіЛ супрацоўнічала як з РСДРП, так і з Бундам. Што цікава, яна выступала супраць стварэння незалежнай Польшчы.

Зусім іншую пазіцыю займала Польская патрыя сацыялістычная (ППС) народніцкага толку, мясцовыя адзелы якой з’явіліся ў гарадах заходняй часткі Беларусі і ў Літве (Вільня, Гродна, Брэст). Гэтыя аддзелы аб’ядналіся ў 1902 г. пад назвай *ППС на Літве*. Партыя выступала за незалежныя і сацыялістычныя Польшчу, Літву і Беларусь, праводзіла вельмі актыўную прапагандысцкую дзейнасць.

У 1901 г. арганізацыйна афармілася *партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (эсэры) да якой далучылася мінская Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі. Праграма партыі прадугледжвала сацыялізацыю зямлі, стварэнне з імперыі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Вялікую ролю эсэры надавалі тэрору супраць улад. Сярод стваральнікаў і кіраўнікоў гэтай агульнарасійскай партыі былі выхадцы з Беларусі Р. Гершуні, С. Кавалік, А. Бонч-Асмалоўскі, К. Брэшка-Брэшкоўская, былыя ўдзельнікі народніцкага руху.

У 1902 г. ў Пецярбургу ўзнікла сацыялістычная нацыянальная беларуская партыя – *Беларуская рэвалюцыйная грамада*, якая ў 1903 г. была перайменавана ў *Беларускую сацыялістычную грамаду – БСГ*. Заснавалі партыю прадстаўнікі беларускай студэнцкай моладзі – браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, А. Бурбіс, К. Кастравіцкі, В. Іваноўскі, А. Пашкевіч і інш. У сваёй праграмме партыя выступала за звяржэнне самадзяржаўя, змену капіталізму сацыялістычным ладам, за беларускую культурна-нацыянальную аўтаномію ў складзе дэмакратычнай Расіі з мясцовым сеймам у Вільні. Прыватная маёмасць на зямлю павінна быць адменена і праведзена ўраўняльнае землеразмеркаванне сярод сялян. БСГ супрацоўнічала з ППС, эсэрамі і Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыяй.

Рост выступленняў, якімі кіравалі партыйныя дзеячы розных накірункаў, занепакоілі ўлады. Яны спрабавалі ўзяць пад кантроль рабочы рух з дапамогай мерапрыемстваў “*паліцэйскага сацыялізму*” ці “*зубатаўшчыны*”. Сутнасць яго выразіў Сямён Зубатаў – кіраўнік маскоўскай паліцыі – улады павінны задаволіць элементарныя эканамічныя і культурныя патрэбы рабочых. На Беларусі ў маі 1901 г. перавербаваныя бундаўцы М. Вільбушэвіч і А. Чамярыскі пры падтрымцы паліцыі дамагліся ад гаспадароў слясарных майстэрань увесці 12-гадзінны працоўны дзень. Як вынік – да створанай імі *Яўрэйскай незалежнай рабочай партыі* перайшла большасць прафсаюзаў, а мясцовыя аддзелы былі створаны па ўсім Заходнем краі. Асноўнымі мэтамі партыі было

падняцце культурнага і эканамічнага ўзроўню рабочых. Дзеля гэтага наладжваліся легальныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы. Аднак у выніку барацьбы з Бундам і пасля некалькіх няўдалых спроб вырашыць канфлікты рабочых з прадпрымальнікамі партыя самараспусцілася ў 1903 г.

Акрамя барацьбы супраць Яўрэйскай незалежнай рабочай партыі Бунд павінен быў весці ўпартую барацьбу супраць ідэалогіі *сіянізму*, які набіраў вялікую папулярнасць на Беларусі сярод яўрэйскага насельніцтва. Сусветная арганізацыя сіяністаў была створана ў 1897 г. У 1900 – на Беларусі дзейнічала 92 сіянісцкіх гуртка, якія не сустракалі перашкод з боку ўлад. У 1902 г. ў Мінску легальна прайшоў Усерасійскі з’езд сіяністаў (у той час, як усялякая палітычная дзейнасць у імперыі была забаронена). Мэтай сіяністаў было стварэнне яўрэйскай дзяржавы каля гары Сіён у Палесціне. У яўрэйскім асяродку няма класаў, таму няма класавай барацьбы і іншых антаганізмаў. Гэта азначае, што са стварэннем сваёй дзяржавы вырашыцца яўрэйскае пытанне – так лічылі сіяністы. Да таго, яны высунулі тэзіс аб богаабранасці яўрэйскага народа, што мела адценне нацыянал-фанатызму.

На працягу 1901-1904 гг. адбыўся значны рост колькасці выступленняў, пад час якіх ставіліся ўжо не толькі эканамічныя, але і палітычныя патрабаванні. Характар рабочых выступленняў пакуль яшчэ быў абарончы. Урад адказаў увядзеннем у беларускіх губернях у канцы 1901 г. становішча ўзмоцненай аховы і рэпрэсій. Гэта не перашкодзіла адсвяткаваць у 1903 г. 1 мая, а ў 1904 г. пад час стачак фіксаваліся перастрэлкі з паліцыяй (у Магілёве). Рост незадаволенасці вызвала няўдалая вайна з Японіяй (1904-1905 гг.). Адначасова пашыралася агітацыйная дзейнасць партый сярод сялянства.

*Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі ў 1905-1907 гг.* Выбух народнага недавольства вызваў растрэл мірнай дэманстрацыі ў Пецярбургу 9 студзеня 1905 г. 11 студзеня ў Мінску пачалася забастоўка салідарнасці з пецярбуржцамі, у якой прынялі ўдзел большасць прадпрыемстваў горада. На працягу студзеня баставалі і мітынгавалі рабочыя 30 гарадоў Беларусі, але вясной эканамічныя патрабаванні яшчэ пераважалі над палітычнымі. Колькасць выступленняў так сама пайшла на спад. Другі этап рэвалюцыі пачаўся з 1 мая 1905 г. з новага ўздыму выступленняў. Да вулічных шэсцяў і перастрэлак з паліцыяй і вайсковымі часцямі дадаліся масавыя выступленні сялянства і батракоў, якія так сама стваралі сялянскія камітэты і выступалі арганізавана (чэрвень, Навагрудскі павет).

Царскі ўрад пайшоў на ўступкі. Мікалай II падпісаў маніфест аб увядзенні парламента – *Дзяржаўнай Думы.* Але рабочыя не атрымалі выбарчых правоў, таму сацыялістычныя партыі байкатавалі выбары ў Думу і працягвалі барацьбу. У канцы верасня ў Маскве распачалася гарадская стачка, якая перарасла ва

Усерасійскую – так пачаўся трэці этап рэвалюцыі. 7-17 кастрычніка 1905 г. дзяржава знаходзілася ў стане калапсу. Спыніліся чыгункі, прадпрыемствы, амаль не працавала сувязь. 17 кастрычніка кіраўнік урада С. Віттэ прымусіў Мікалая II падпісаць *Маніфест аб абвяшчэнні дэмакратычных свабод* (свободы слова, друка, сходаў, саюзаў, веравызнанняў) і наданні Думе права заканадаўчай ініцыятывы. У ходзе Усерасійскай стачкі ў Расіі ствараліся Саветы для кіравання рэвалюцыйнымі дзеяннямі, але на Беларусі супраць Саветаў былі Бунд і эсэры, таму ствараліся толькі безпартыйныя каардынацыйныя камітэты па ініцыятыве эсэраў.

18 кастрычніка 1905 г. ў гарадах адбыліся шматлюдныя мітынгі і дэманстрацыі з нагоды выдання Маніфеста. Але па ўзгадненню з цэнтральнымі ўладамі гэтыя дэманстрацыі былі разагнаныя з прымяненнем зброі. Расстралялі дэманстрацыі ў Віцебску і Гомелі, у Мінску пад час *курлоўскага расстрэлу* загінула каля 100 чалавек. У цэлым кастрычніцкі націск працоўных аслаб, бо сваю ролю адыграў Маніфест аб свабодах. Ад рэвалюцыі адыйшлі ліберальныя і буржуазныя дзеячы, якія цалкам дасягнулі сваіх мэтаў. На гэтым скончыўся трэці этап рэвалюцыі. Яго вынікам было стварэнне новых палітычных партый, якія пачалі палітычную дзейнасць у рамках парламенцкай барацьбы. Былі так сама легалізаваны нізавыя структуры сацыял-дэмакратычных партый, якія пачалі шырокую агітацыйную дзейнасць.

Рэвалюцыйныя партыі працягвалі барацьбу бо галоўная іх мэта – зваржэнне самадзяржаўя не была дасягнута. На снежань была намечана ўсеагульная забастоўка, якая павінна была перарасці ва ўзброеннае паўстанне. 7 снежня пачаўся чацвёрты этап рэвалюцыі. РСДРП, Бунд, ПСР (эсэры) выдалі зварот “Да ўсяго народа” з заклікам паўстаць супраць царызма. Агульныя забастоўкі пачаліся ў буйнейшых гарадах Беларусі. 18 снежня пачалося ўзброенае паўстанне ў Маскве. Але на Беларусі выступленні працоўных у ўзброенную форму не перайшлі. Улады адказалі вельмі жорсткімі мерамі. Былі праведзены масавыя арышты. Выступленне ў Маскве было падаўлена. Рэвалюцыйныя партыі заявілі аб часовым адступленні.

Улады спалучалі рэпрэсіі з некаторымі ўступкамі на карысць працоўных. Так, 2 снежня 1905 г. была адменена крымінальная адказнасць за ўдзел у стачках, а 11 снежня згодна з законам аб выбарах у Дзяржаўную думу рабочыя атрымалі выбарчыя правы. У сакавіку 1906 г. выйшлі Часовыя правілы аб стварэнні саюзаў і грамадскіх арганізацый, якія дазволілі ствараць прафесійныя саюзы. У красавіку адбыліся выбары ў Думу, і яна пачала дзейнасць з 27 красавіка 1906 г. Выбары былі непрамыя, шматступенчатыя. Сацыял-дэмакратычныя партыі байкатавалі выбары ў першую Думу. Але сарваць

выбары яны не здолелі. У выбарах удзельнічала шырокае кола партый, створаных пасля маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.

Партыя *канстытуцыйных дэмакратаў* (*кадэтаў*) створаная на I з'ездзе земскіх дзеячоў у кастрычніку 1905 г. стаяла на пазіцыі будаўніцтва ў Расіі парламенцкай дзяржавы на заходні манер, выступала супраць федэралізму але дапускала культурную аўтаномію народаў імперыі.

На Беларусі дзейнічала аналагічная мясцовая партыя – Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, якую ў канцы 1905 г. стварыў віленскі каталіцкі біскуп Э. Роп. Гэты дзеяч вызначаўся ліберальнымі поглядамі і блізкасцю да беларускага нацыянальнага руху, быў прыхільнікам увядзення беларускай мовы ў касцёл.

"Саюз 17 кастрычніка" ці *акцябрысты* стварылі партыю ў лістападзе 1905 г. На Беларусі былі ўтвораны адзелы ў Віцебску, Мінску, Гродне, Магілёве. Акцябрысты кантралявалі такія выданні, як "Минская речь", "Витебский голос". Падтрымлівалі партыю мясцовае чыноўніцтва, русскае насельніцтва. Патрыя абмяжоўвалася падтрымкай выканання палажэнняў Маніфеста 17 кастрычніка, адвяргала ідэю любой нацыянальнай аўтаноміі ў імперыі акрамя Фінляндыі.

На Беларусі мелі свае аддзелы іншыя арганізацыі – Партыя мірнага абнаўлення, блізкая да кадэтаў, манархічны "Саюз русского народа" (лістапад 1905 года), які ствараў "чорныя сотні" і чыніў пагромы ў яўрэйскіх гарадах, кансерватыўны Усерасійскі нацыянальны саюз (чэрвень 1908 г.), які прапаведаваў ідэі нацыяналізму, панавання рускіх у імперыі, падтрымліваў неабмежаванае самадзяржаўе.

Утвараліся і мясцовыя арганізацыі. Так, "Белорусское общество" (з 1908 г.), якое складалася з ліберальнай інтэлігенцыі і заможнага сялянства, выступала за саюз з урадам супраць каталіцкіх памешчыкаў. Таварыствы "Крестьянин" і "Русский окраинный союз" (з кастрычніка 1906 г.) падтрымлівалі лозунг "Расія для рускіх і кіраваць ёю павінны рускія". Выступалі за ліквідацыю ў краі эканамічнай перавагі "польскіх" памешчыкаў і яўрэйскай буржуазіі. Свае ідэі яны прпагандавалі праз газеты "Виленский вестник", "Минское слово".

У першую Думу ад Беларусі было абрана 36 дэпутатаў, у тым ліку 13 сялян. Пачатак дзейнасці парламента супаў з новым ростам выступленняў працоўных, якія цяпер кантраляваліся прафсаюзамі. Ад Думы чакалі вырашэння *зямельнага пытання*, таму наглядаўся актыўны рух сярод сялянства і салдат, якія амаль цалкам паходзілі з сялянскага саслоўя. У красавіку-ліпені сходы салдат адбываліся ў Мінску, Баранавічах, Бабруску, Брэсце, Кобрыне. Пад час працы ў Думе дэпутаты прапанавалі некалькі варыянтаў зямельнай

рэформы, але яны былі з пункту гледжання ўрада празмерна радыкальнымі, бо прапанавалі ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне (праз нацыяналізацыю ці паступовы выкуп дзяржавай). Прапанаваны ўрадам праект Дума рыхтавалася адхіліць. Дэпутаты-сяляне ад Беларусі, падманутыя сваімі землякамі, галасавалі супраць нацыяналізацыі зямлі, гэта азначае, супраць сваіх інтарэсаў. Да тагож фракцыя аўтанамістаў – куды ўвайшлі большасць абраных ад Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі дэпутатаў патрабавалі права на шырокае самакіраванне для Польшчы. 9 ліпеня 1906 г. Мікалай II распусціў парламент, распачаў рэпрэсіі і прызначыў новыя выбары.

У гэты час прадпрымальнікі так сама пачалі аб'яднацца для супрацьстаяння стачкам і забастоўкам. Ствараліся рэгіянальныя манаполіі – сіндыкаты і таварыствы, якія эфектыўна прымянялі *лакаўты* – масавыя звальненні рабочых пад час забастовак ці стачак з усіх рэгіянальных прадпрыемстваў галіны.

У гэтых умовах націску на працоўных адбыліся выбары ў другую Думу. У іх прынялі ўдзел усе сацыял-дэмакратычныя партыі. Адзіным блокам на выбары пайшлі правыя арганізацыі – акцябрысты, Расійскі акраінны саюз, манархісты. У выніку ад Беларусі было абрана 15 дэпутатаў ад правага блока, 11 аўтанамістаў, 2 кадэта і 8 беспартыйных. Такім чынам, перамогу атрымалі дзве групоўкі, якія адмаўлялі ў існаванні беларускаму народу. Сацыял-дэмакратычныя партыі не здолелі правесці сваіх дэпутатаў, бо перамога іх кандадатаў аб'яўлялася несапраўднай і анулявалася. У Расіі наглядалася крыху іншая сітуацыя – там левыя партыі дамагліся значных перамог. Другая Дума дзейнічала так сама кароткі тэрмін – з 20 лютага да 3 чэрвеня 1907 г. Зноў абвастрыліся спрэчкі па *аграрнаму пытанню*. Партыя кадэтаў не атрымала большасці ў Думе і ўрад праігнараваў іх варыянт рэфармавання. Паколькі ў Думе ніводны бок не атрымаў перавагі, Думу палічылі нядольнай на сур'ёзныя справы і па патрабаванню правых партый распусцілі. Але адначасова Мікалай II змяніў выбарчае заканадаўства (17 чэрвеня), чаго не меў права рабіць без згоды парламента. Таму роспуск другой Думы лічыцца *чэрвеньскім дзяржаўным пераваротам*. Ім скончылася рэвалюцыя 1905-1907 г. Урад перайшоў да жорсткіх метадаў у кіраванні краінай. Рэвалюцыйныя партыі, у тым ліку і БСГ, знаходзіліся ў глыбокім крызісе, так сама як і партыя кадэтаў. На базе мясцовых яе арганізацый была створана ў 1907 г. Краявая партыя Літвы і Беларусі. Польскія памешчыкі і святары, якія ўвайшлі ў партыю, падтрымлівалі патрабаванне аб палітычным раўнапраў'і палякаў і католікаў.

З 1 лістапада 1907 па 9 чэрвеня 1912 г. і з 15 лістапада 1912 па 25 лютага 1917 года дзейнічалі III і IV Дзяржаўныя Думы, у якія ад Беларусі выбіраліся амаль выключна прадстаўнікі правых партый і чарнасоценных арганізацый.

Гэтыя парламенты цалкам падтрымлівалі ўсе мерапрыемствы ўрада ва ўсіх сферах жыцця краіны.

Па патрабаванню П. Сталыпіна, які праводзіў аграрную рэформу, ва ўсходняй і цэнтральнай Беларусі была праведзена *земская рэформа* (14 мая 1911 г.), якая мела значныя адрозненні ад рэформы 1864 г. ў расійскіх губернях. Замест саслоўных курый выбаршчыкаў у органы земскага самакіравання стваралася дзве – “руская” і “польская”, а каб павялічыць прадстаўніцтва праваслаўнага “рускага” сялянства маёмасны цэнз для іх панізілі ў 2 разы. Гэтыя меры павінны былі недапусціць панавання ў земствах каталіцкіх “польскіх” памешчыкаў.

Падзеі рэвалюцыі садзейнічалі яшчэ большаму абуджэнню ў асяроддзі беларускага нацыянальнага руху. У маі 1907 г. прайшоў настаўніцкі з’езд у Вільні, які выказаўся за навучанне на беларускай мове. З 10 лістапада 1906 г. выдавалася газета на беларускай мове – “Наша ніва”, якая пасля дзяржаўнага пераварота стала цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Для сялян рэдакцыя выдавала “Беларускі каляндар” і часопіс “Саха”. З 1912 г. нашаніваўцы наладзілі выпуск грамадска-палітычнага і літаратурнага альманаха “Маладая Беларусь”. У выдавецтве “Загляне сонца і ў наша ваконца” (1908-1914 г.) выходзілі дзесяткі беларускіх кніжак. Такім чынам, беларускі рух на гэты час абмяжоўваўся культурна-асветніцкай працай, пашырэннем сярод насельніцтва навукова-папулярных ведаў у розных галінах гаспадаркі і навукі. “Наша ніва” садзейнічала з’яўленню ў беларускай літаратуры таленавітых паэтаў і пісьменнікаў, гордасці беларускай літаратуры.

Аднак вельмі цяжка было супрацьстаяць той прапагандзе вялікадзяржаўнага шавінізму, што існавала на Беларусі. Улады падтрымлівалі правыя арганізацыі, садзейнічалі чарнасоценным пагромам у беларускіх гарадах. Алаль прыпыніўся сялянскі і рабочы рух. Толькі ў 1912-1914 гг. намеціўся пад’ём забастовачнай барацьбы і сялянскіх выступленняў. Рэакцыя і рэпрэсіі на Беларусі былі больш мэтанакіраванымі і паслядоўнымі, чым у астатняй імперыі.

***Праблема гістарычнага выбару пасля падзення ў Расіі самадзяржаў’я.*** 23 лютага 1917 г. ў Петраградзе пачалася 2-я буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. 27 лютага паўстаўшыя звerглі царскае самадзяржаўе. Звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе дайшлі да Беларусі 1-4 сакавіка. Па прыкладу Петраграда ў Беларускіх гарадах стварыліся *Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў*, народная міліцыя. За сакавік-красавік на Беларусі было створана 37 Саветаў. Найбольшым уплывам на Беларусі і Заходнім фронце карыстаўся Мінскі Савет створаны па ініцыятыве бальшавікоў 4 сакавіка. Мінскую гарадскую міліцыю ўзначаліў М. Ф. Фрунзе. Мінскі Савет арганізаваў

выданне газеты “Известия Минского Совета рабочих депутатов”. Арганізацыйнае афармленне Мінскага Савета завяршалася 8 сакавіка. Ен стаў аб'яднаным Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У адпаведнасці з загадам №1 Петрасавета Мінскім Саветам было прынята рашэнне аб утварэнні салдацкіх камітэтаў. Быў выбраны выканаўчы камітэт Савета на чале з меншавіком-інтэрнацыяналістам Б. Позернам, намеснікам – бальшавіком І. Любімавым. Аналагічным чынам стварыліся Саветы і ў іншых гарадах Беларусі.

Саветы Беларусі прызналі кіруючую ролю Петраградскага Савета і па яго прыкладу Часовы ўрад. Буржуазныя органы ўлады на Беларусі спачатку ўзніклі як Часовыя гарадскія камітэты. У Мінску Часовы гарадскі камітэт быў ўтвораны 4 сакавіка 1917 г. Падобныя камітэты былі ўтвораны ў Віцебску, Магілёве, Гомелі, Полацку. У адрозненні ад Саветаў Часовы ўрад абапіраўся на месцы на грамадска-дзяржаўныя структуры створаныя пры царызме, земствы і органы гарадскога самакіравання. Дасягнутае пагадненне паміж Саветамі і Часовым урадам прадвызначыла мірныя ўзаемаадносіны як у цэнтры (Петраград, Масква), так і на пераферыі (Беларусь).

Рэвалюцыя і загад №1 Петраградскага Савета, пастанова Мінскага Савета паклалі пачатак дэмакратызацыі войска. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага раіла штабу Заходняга фронту стаць на шлях кампрамісу з Саветамі. Выбары салдацкіх камітэтаў пачаліся ў сакавіку-красавіку 1917 г. У канцы жніўня на Заходнім фронце дзейнічалі 7284 камітэты. Абараняючы грамадзянскія правы салдат, камітэты пастаянна ўмешваліся ва ўзаемаадносіны салдат з афіцэрамі. Нярэдка былі выпадкі адхілення афіцэраў ад пасад і іх арышты. Пачаліся выпадкі адмовы цэлых дывізій падпарадкоўвацца камандаванню, дызертырства з фронту стала масавым.

Такім чынам на фронце склалася двоўладдзе, што паскорыла разлажэнне войска. З 7 па 17 красавіка 1917 г. ў Мінску адбыўся І з'езд салдацкіх і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту. На з'ездзе прысутнічала 700 дэлегатаў. З'езд выказаўся за ўсталяванне трывалага міру на аснове самавызначэння народа, за прадстаўленне салдатам палітычных правоў і свабод, за скасаванне звання “афіцэр”. На З з'ездзе было разгледжана і аграрнае пытанне, але поўнае яго вырашэнне адкладвалася да Установчага сходу. Сваімі рашэннямі з'езд замацаваў перамогу буржуазна-дэмакратачнай рэвалюцыі ў войску, што знаходзілася на тэрыторыі Беларусі. Такім чынам буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя да сярэдзіны красавіка перамагла на Беларусі ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага жыцця.

## Тэма 8. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі і беларускага замежжа (1919-1939 гг.)

*Ключавыя паняцці:* VI з'езд РСДРП (б), Другі ўсерасійскі з'езд Саветаў, ВРК Заходняй вобласці і фронту, Аблвыканкамзах, Беларускі нацыянальны камітэт, Цэнтральная рада беларускіх арганізацый, Вялікая беларуская Рада, Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з’езду, Беларуская Народная Рэспубліка, Рада БНР, КПБ(б), Маніфест часовага ўрада Беларусі, І-ы Усебеларускі з'езд Саветаў.

**План лекцыі:** 1.Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Першы Усебеларускі з’езд.
2.Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэма-кратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Пазіцыя бальшавікоў у нацыянальным пытанні.

***Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Першы Усебеларускі з’езд.*** Вясной 1917 г. яшчэ больш пагоршылася сацыяльна-эканамічнае становішча краіны. У народзе ўзраслі антыўрадавыя настроі. Гэта спрыяла бальшавікам ажыццяўляць курс *VI з'езда РСДРП(б)* на ўзброенае паўстанне. Яны пачалі праводзіць сваіх прадстаўнікоў у Саветы і дабіліся ў гэтым поспеху. Але ў Беларусі бальшавікі мелі большасць толькі ў Мінскім і Гомельскім Саветах. Што тычыцца сялянскіх саветаў, то іх абсалютная большасць знаходзілася пад уплывм эсэраў і БСГ. Бальшавіцкая арганізацыя на Беларусі на 95% складалася з салдат. Гэта давала магчымасць бальшавікам разгарнуць падрыхтоўку ўзброеных фарміраванняў (Чырвонай гвардыі) для захопу ўлады.

25 кастрычніка 1917 г. рабочыя, салдаты пад кіраўніцтвам ЦК РСДРП (б) зверглі Часовы ўрад. 26 кастрычніка *Другі ўсерасійскі з'езд Саветаў* абвясціў савецкую уладу ў цэнтры і на месцах, прыняў Дэкрэт аб міры і Дэкрэт аб зямлі. Быў ўтвораны Часовы рабоча-сялянскі ўрад (СНК) на чале з У. І. Леніным. Апоўдні 25 кастрычніка бальшавікі Мінска атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Мінскі Савет абвясціў сябе ўладай. Па яго ўказанні з турмы былі вызвалены салдаты арыштаваныя за антыўрадавыя выступленні. З іх быў арганізаваны Першы рэвалюцыйны, імя Мінскага Савета, полк. Пераходам улады да Саветаў ажыццяўлялі, створаныя бальшавікамі, ваенна-рэвалюцыйныя камітэты (ВРК), якія абапіраліся на салдацкія масы. *ВРК*

*Заходняй вобласці і фронту* ўзначалілі бальшавікі В. Кнорын, К. Ландар, А. Мяснікоў. Працідзеянне бальшавікам у Мінску аказаў Камітэт выратавання рэвалюцыі, на чале з меньшавіком Т. Калатухіным. Камітэт увеў у Мінск Каўказкую дывізію і прад'явіў Мінскаму Савету ўльтыматум з патрабаваннем перадачы яму ўсей улады ў горадзе і на Заходнім фронце. Мінскі Савет вымушаны быў пайсці на часовы кампраміс з Камітэтам выратавання. Неўзабаве да бальшавікоў Мінска падаспела дапамога (браняпоезд) і суадносіны змяніліся на карысць бальшавікоў. Уладу ў Мінску і на Заходнім фронце зноў узяў у свае рукі ВРК Заходняй вобласці і фронту. Ён распусціў Камітэт выратавання, Т. Калатухіна арыштавалі. Пры дапамозе ВРК бальшавікі распусцілі Саветы ў якіх не мелі пераважанай большасці і правялі іх перавыбары, чым забяспечылі ўстанаўленне сваей дыктатуры. Такі характар насіла змена ўлады ў Віцебску і Гомелі. З некаторымі асаблівасцямі так адбылося і ў Магілеве. Савецкі ўрад аб'явіў генерала М. Духоніна звергнутым з пасады Галоўнакамандуючага рускай арміі. Стаўка была ліквідавана, а ўлада перайшла ў рукі ВРК. Вярхойным глаўнакамандуючым быў прызначаны прапршчык М. Крыленка.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Беларусь была падзелена на часткі і з’яўлялася франтавой і прыфрантавой тэрыторыяй. У краіне нарасталі эканамічныя праблемы. З сакавіка па лістапад 1917 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 26 палітычных партый і арганізацый. У сакавіку 1917 г. адбыўся з’езд беларускіх палітычных партый і арганізацый. Быў створаны *Беларускі нацыянальны камітэт* для падрыхтоўкі выбараў у Беларускую краёвую раду. Старшынёй БНК стаў памешчык з Піншчыны Раман Скірмунт.

Дэлегацыя на чале з Р. Скірмунтам была накіравана на перамовы з Часовым урадам. Міністру-старшыні Часовага ўрада Г. Львову была накіравана запіска аб неабходнасці аўтаноміі для Беларусі, пашырэнні мясцовага самакіравання.

БНК у ліпені 1917 г. быў рэарганізаваны ў *Цэнтральную раду беларускіх арганізацый*, якая аб’яднала 23 арганізацыі. У кастрычніку 1917 г. Рада атрымала назву *Вялікая беларуская Рада (ВБР)*.

ВБР, БАК, Беларускі выканаўчы камітэта Заходняга фронту прынялі рашэнне аб скліканні Усебеларускага з’езда. Самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы з’езда прыняў Беларускі абласны камітэт (БАК), які быў створаны пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў з ліку дэлегатаў ад беларускіх губерній, прадстаўнікоў арміі і флоту. БАК павёў перамовы з кіраўніцтвам Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей Савецкай Расіі адносна нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва.

Усебеларускі з’езд праходзіў у Мінску з 5 па 17 снежня 1917 г. У перыяд 15–17 снежня з’езд падыйшоў да вырашэння пытання аб арганізацыі краёвай улады і самавызначэння Беларусі. Галоўным пунктам разыходжання было ці стварэнне самастойнай дзяржавы ці аўтаномія ў складзе Савецкай Расіі. Але нават памяркоўнае патрабаванне самавызначэння ў форме рэспублікі ў складзе агульнарасійскай федэрацыі не мела поспеху.

Між тым, вечарам 17 снежня на нарадзе з лідэрамі фракцый і зямляцтваў з’езд арганізаваў са свайго складу орган краёвай улады – *Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў*, які часова станавіўся на чале кіравання краем. У ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. з’езд быў разагнаны бальшавікамі. 18 снежня на пасяджанні часткі прэзідыўма і савета з’езда ў памяшканні дэпо Лібава-Роменскай чыгункі было вырашана абраць *Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага* з’езда, які ўзначаліў Язэп Варонка.

Факт склікання Усебеларускага з’езда, шырокае абмеркаванне праблемы нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння мелі выключнае значэнне. З’езд засведчыў аб усведамленні беларускім народам сваіх палітычных інтарэсаў. Лепшыя прадстаўнікі беларускага народа заклалі першыя камяні ў фундамент беларускай дзяржавы.

***Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Пазіцыя бальшавікоў у нацыянальным пытанні.*** Ва ўмовах развалу фронта бальшавікі не здолелі арганізаваць абарону Беларусі і ў ноч на 19 лютага 1918 г. пакінулі Мінск. Уладу у свае рукі ўзяў Выканкам Усебеларускага з'езду. 21 лютага 1918 г. Выканкам звярнуўся да народа Беларусі з *першай Устаўной граматай*, у якой абвясціў сябе часовай уладай на тэрыторыі Беларусі і абявязаўся склікаць Усебеларускі ўстаноўчы з'езд. 9 сакавіка 1918 г. Выканкам Усебеларускага з'езда прыняў *II Ўстаўную грамату*, у якой абвясціў Беларусь *Беларускай Народнай Рэспублікай*. Выканкам быў пераіменаваны ў *Раду БНР*, прэзідыўм якой узначаліў прадстаўнік БСГ І.М. Серада.

Рада БНР узяла курс на ўсталяванне ў Беларусі дэмакратычных асноў грамадскага ладу. Прадстаўнікі эсэраў, меньшавікоў, бунда ўвайшлі ў Раду БНР. 25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады БНР была прынята *III Ўстаўная грамата*. Яна абвяшчала незалежнасць БНР. У грамаце Рады БНР патрабавалась перагледзець ўмовы Брэсцкага міру, настойвалася на тым, каб Рада БНР самастойна падпісала мірнае пагадненне як з урадамі Германа-Аўстрыйскага блока, так і Савецкім урадам. Незалежнасць БНР прызналі дэ-юрэ Украінская Народная Рэспубліка, Літва; дэ-факта – Турцыя, Фінляндыя. З боку Савецкай Расіі пастуліў пратэст супраць абвяшчэння БНР. Бальшавікі заяўлялі, што

стварэнне БНР – гэта спроба адарваць Беларусь ад Расіі і далучыць да Германіі, аднавіць старыя парадкі.

Няўдалай была спроба стварэння беларускага войска. Германскія ўлады баяліся, што зброя можа быць павернута супраць іх. Рада БНР даволі паспяхова займалася культурна-асветніцкай дзейнасцю. Быў атрыманы дазвол на выданне 14 беларускамоўных газет і часопісаў, адкрыты педінстытут, створана бюро па напісанню падручнікаў, а для іх выдання – таварыства "Асвета". У эканамічнай вобласці была арганізавана Беларуская гандлёвая палата і распрацавана праграма ажыццяўлення фінансава-грашовай сістэмы.

Пасля лістападаўскай 1918 г. рэвалюцыі ў Германіі, Савецкі ўрад дэнансаваў Брэсцкі мірны дагавор і рушыў Чырвоную Армію на Захад. Многія члены Рады БНР вумушаны былі пакінуць Мінск. Такім чынам, у выніку неспрыяльных знешне-палітычных і ўнутраных умоў няўдала завяршылася першая спроба арганізацыі беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове. Але дзейнасць Рады БНР зрабіла значны ўплыў на рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Гэта прымусіла бальшавіцкі ўрад пайсці на стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі.

З сакавіка 1918 г. быў заключаны Брэсцкі мірны дагавор, па якому землі Беларусі па лініі Рыга-Двінск-Свянцяны-Ліда-Пружаны адышлі да Германіі. Акупацыйную ўладу на Беларусі ўзначальваў генерал Эрых фон Фолькенгайм. Немцы забаранілі дзейнасць рэвалюцыйна-дэмакратычных партый. Была адноўлена дзейнасць Саюза землеўладальнікаў і органаў мясцовага самакіравання: гарадскія думы, земствы. Частку прадпрыемстваў немцы перадалі ўладальнікам, а абсталяванне другой часткі прадпрыемстваў вывезлі ў Германію. Адносна сялян у практыку ўвайшлі рэквізіцыі хлеба, мяса, фуражу на патрэбы нямецкай арміі. У адносінах да мірных жыхароў парушалася міжнароднае правы: наладжваліся аблавы, людзей вывозілі ў Германію (вясной 1918 у Германію было вывезена 15 тыс. чалавек), ствараліся канцэнтрацыйныя лагеры, праводзіліся карныя экспедыцыі, пры якіх ажыццяўляўся масавы растрэл мірных жыхароў. Асабліва лютавалі нямецкія карнікі ў тых раёнах, дзе дзейнічалі партызанскія атрады – на Гродзеншчыне, Міншчыне, каля Полацка, Віцебска, Магілева, Быхава, Жлобіна. У лістападзе 1918 г. пасля паражэння Траіснага саюза ў І-й сусветнай вайне і рэвалюцыі ў Германіі бальшавікі анулявалі Брэсцкі мір і рушылі на Захад. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія заняла Мінск. Было заяўлена аб аднаўленні Савецкай улады. З гэтай мэтай утвараўся губернскі ВРК.

30 снежня 1918 г. ў Смаленску Паўночна-заходні абласны камітэт РКП(б) склікаў VI Паўночна-заходнюю абласную канфірэнцыю РКП(б). Яна прыняла рэзалюцыю "Аб абвяшчэнні Заходняй камуны Беларускай Савецкай

Рэспублікай". Меркавалася на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай губерняў утварыць самастойную сацыялістычную рэспубліку Беларусь. Паўночна-заходнюю арганізацыю РКП(б) пераймяноўвалі ў *КПБ(б)*. Часовы рабочы сялянскі ўрад БССР узначаліў беларус-бальшавік Зм. Жылуновіч.

1 студзеня 1919 г. ў Смаленску быў абнародаваны *Маніфест часовага ўрада Беларусі*. У Маніфесце абвяшчалася ўтварэнне БССР і даваліся асноўныя палажэнні яе дзяржаўнага статуса. Уся ўлада на Беларусі пераходзіла ў рукі Саветаў. Фабрыкі, землі, лясы, заводы і банкі станавіліся здабыткам народа. 5 студзеня 1919 г. сталіцай БССР стаў Мінск, куды пераехаў са Смаленска Часовы ўрад. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай губерняў БССР і аб'яднання таго, што ад яе засталося з Літоўскай ССР.

Такім чынам, стваралася буферная дзяржава паміж РСФСР і Польшчай з мэтай прадухілення адкрытай вайны. Гэта рашэнне ЦК РКП(б) выклікала пратэст сярод членаў былога ўрада БССР. Зм. Жылуновіч і яго прыхільнікі напісалі пісьмо ЦК РКП(б), у якім выказалі свой пратэст. За гэта яны былі выключаны з урада БССР, а Зм. Жылуновіч арыштаваны.

*1-ы Усебеларускі з'езд Саветаў*, які павінен быў зацвердзіць утварэнне Літоўска-Беларускай ССР, адбыўся ў Мінску 2-3 лютага 1919 г. На ім прысутнічаў старшыня ВЦВК Я. М. Свярдлоў. Па прапанове Свярдлова з'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні БССР з Літоўскай ССР. З'езд прыняў Канстытуцыю БССР, аналагічную Канстытуцыі РСФСР 1918 г. Па Канстытуцыі, вышэйшым органам улады ў БССР абвяшчаўся ўсебеларускі з'езд Саветаў, а ў перыяд паміж з'ездамі – ЦВК выбраны з'ездам. Функцыі ўрада ўскладаліся на Вялікі прэзідыўм, які фарміраваўся ЦВК. Узначаліў Вялікі Прэзыдыўм А. Мяснікоў. Аб'яднанне Літвы і Беларусі ў адзіную дзяржаву ЛітБел адбылося 27 лютага 1919 г. Старшынёй новай дзяржавы са сталіцай у Вільні стаў К. Цыхоўскі, а СНК узначаліў В. Міцкявічус-Кансукас. ЛітБел праіснаваў да наступлення палякаў у 1919 г.

Пошук формаў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва праходзіў у абстаноўцы сутыкнення меркаванняў у партыі бальшавікоў. Яны праявіліся і сярод кіруючых партыйных кадраў Беларусі. Кіраўнікі Паўночна-Заходняга абкама партыі А. Мяснікоў, В. Кнорын, М. Калмановіч, К. Ландер і інш. лічылі, што беларускія губерні аб'яднанай тэрытарыяльнай абласной адзінкай павінны ўвайсці ў склад РСФСР. У іх разуменні РСФСР належала стаць першаячэйкой сусветнага братэрства народаў. Гэты пункт гледжання знайшоў ўвасабленне 9 снежня 1917 г. ў рэдакцыйным артыкуле газеты “Рэвалюцыйная Стаўка” (органа Цэнтральнага камітэта дзеючых армій, флоту і Ваеннарэвалюцыйнага

камітэта пры Рэвалюцыйнай Стаўцы), якая выдавалася ў Магілёве. У дадзеным артыкуле адзначалася: “... Час нацыянальных дзяржаў ужо прайшоў ... Мы ідзем да наднацыянальнага аб'яднання дэмакратыі. Наша партыя ніколі не стаяла за разбурэнне стварыўшыхся вялікіх дзяржаўных арганізмаў і стварэнне дробных нацыянальных рэспублік”.

## Тэма 9. Грамадска палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.)

*Ключавыя паняцці:* Версальска-Вашынгтонская сістэма, Заходняя Беларусь, Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ, Рыжскі мірны дагавор.

**План лекцыі:** Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.

***Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.*** Восенню 1918 г. ваенна-палітычнае становішча краін Чацвярнога саюза рэзка пагоршылася. Спыненне баявых дзеянняў уздымала шмат праблем пасляваеннага ўладкавання сусвету. З мэтай іх вырашэння была склікана Парыжская канферэнцыя, якая пачала працу 18 студзеня 1919 г. у складзе 27 краін і 5 англійскіх дамініёнаў.

*Версальска-Вашынгтонская сістэма* міжнародных адносін, гэта сусветны парадак, асновы якога былі закладзены па завяршэнні Першай сусветнай вайны 1914-1918 гг. Версальскім мірным дагаворам, дамовамі з саюзнікамі Германіі, а таксама пагадненнямі, заключанымі на Вашынгтонскай канферэнцыі 1921-1922 гг. Версальска-Вашынгтонская сістэма склалася ў 1919-1922 гг. і была закліканая фармальна замацаваць вынікі Першай сусветнай вайны.

На паседжаннях у Версалі беларускае пытанне не падымалася. Заходнія дзяржавы не лічылі неабходным утвараць новую дзяржаву на заходніх землях былой Расійскай імперыі. Пасля Першай сусветнай вайны пры фарміраванні сістэмы міжнародных адносін (Версальска-Вашынгтонскай сістэмы) еўрапейскія краіны-пераможцы імкнуліся зацвердзіць уласнае дамінаванне пры ігнараванні інтарэсаў невялікіх народаў на ўсходзе Еўропы.

Прыярытэтнымі напрамкамі палітыкі Вялікабрытаніі і Францыі былі ізаляцыя Краіны Саветаў і стрымліванне Германіі. Таму яны пайшлі на вялікія саступкі Польшчы як свайму бліжэйшаму саюзніку ў гэтым рэгіёне. Намаганні беларускіх эмігрантаў, накіраваныя на ўсталяванне незалежнай БНР ці

фарміраванне якіх-небудзь беларускіх небальшавіцкіх дзяржаўных структур у Беларусі, аказаліся марнымі.

У лістападзе 1918 г. адрадзілася Польская дзяржава. Яе кіраўніцтва на чале з Юзэфам Пілсудскім імкнулася аднавіць Рэч Паспалітую. Ужо ў снежні 1918 г. пачалося наступленне польскіх войскаў на Беларусь і Украіну. Да лета 1919 г. польскімі войскамі была захоплена значная тэрыторыя Беларусі, дзе быў усталяваны польскі акупацыйны рэжым. Польскія ўлады пачалі масавую паланізацыю беларускага насельніцтва: абмяжоўвалася выкарыстанне беларускай мовы, дзяржаўнай мовай была аб'яўлена польская, зачыняліся беларускія школы і ўстановы культуры.

Жорсткая палітыка польскіх акупацыйных уладаў выклікала магутны партызанскі рух, які ўзначальвалі беларускія эсэры і бальшавікі. Паміж імі была дамова аб стварэнні адзінага фронту барацьбы. У барацьбе з польскай акупацыяй праславіўся Васіль Талаш. У 75-гадовым узросце ён арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад у колькасці каля 300 чалавек, які дзейнічаў на тэрыторыі беларускага Палесся. Масавы і арганізаваны рух супраціву паскорылі выгнанне акупантаў з тэрыторыі Беларусі.

У выніку наступлення войск Чырвонай Арміі на Польскім фронце быў вызвалены Мінск, дзе 31 ліпеня 1920 г. была прынята *Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ.*

Пасля вызвалення ў жніўні 1920 г. Брэста войскі Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам М. Тухачэўскага рушылі далей на тэрыторыю Польшчы з мэтай перанясення пралетарскай рэвалюцыі ў краіны Еўропы. Аднак надзеі бальшавікоў на сусветную рэвалюцыю не апраўдаліся. Пачалося контрнаступленне польскай арміі, якая адкінула войскі Чырвонай Арміі і захапіла значную тэрыторыю Заходняй Беларусі. У гэтых абставінах савецкі ўрад вымушаны быў пайсці на мірныя перамовы з Польшчай.

*Рыжскі мірны дагавор* быў падпісаны 18 сакавіка 1921 г. ў Рызе дэлегацыямі Польшчы, РСФСР і УССР у Рыжскім палацы Шварцкопф. Ад імя Савецкай Беларусі дагавор падпісала РСФСР, што і было адзначана ў яго прэамбуле. Рыжскі мірны дагавор узаконіў захоп Польшчай значнай часткі беларускіх і украінскіх зямель. Дэмакратычны прынцып права беларускай нацыі на нацыянальна-тэрытарыяльнае самавызначэнне ў этнічных межах з маўклівай згоды вядучых еўрапейскіх краін быў праігнараваны польскім бокам.

Дагаворныя бакі пацвердзілі незалежнасць БССР. Згодна з 2-м артыкулам дагавора савецка-польская граніца ўстанаўлівалася значна далей на ўсход ад «лініі Керзана». Да Польшчы адыходзіла Заходняя Беларусь, тэрыторыя якой складала 113 тыс. км з насельніцтвам 4,6 млн. чал. (1931). Паводле дагавора бакі абавязваліся паважаць дзяржаўны суверэнітэт адзін аднаго, адмаўляліся ад

умяшання ва ўнутраныя справы, варожай прапаганды. Польшча абавязвалася прадаставіць беларусам, рускім і ўкраінцам усе правы, якія забяспечвалі б свабоднае развіццё культуры, мовы і веравызнання. Такія ж правы прадастаўляліся палякам на тэрыторыі РСФСР, БССР і УССР. Бакі ўзаемна адмаўляліся ад патрабаванняў вярнуць расходы і страты, панесеныя ў час вайны. Кожны з бакоў прадастаўляў грамадзянам поўную амністыю за палітычныя злачынствы.

Польскі і савецкі ўрады РСФСР, УССР і БССР сістэматычна парушалі абавязацельствы не весці варожую прапаганду, не дапускаць на сваіх тэрыторыях утварэння і знаходжання арганізацый і груп, дзейнасць якіх была скіравана супраць дзяржаў, што падлісалі дагавор. Польскія ўлады ўстанавілі ў Заходнея Беларусі жорсткі рэжым сацыяльнага, нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту. Дагавор дзейнічаў да пачатку Другой сусветнай вайны і ўз'яднання Зах Беларусі з БССР.

## Тэма 10. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (50-я-80-я гг. XX ст.)

**Асноўныя паняцці:** “сусветная сістэма сацыялізма”, “халодная вайна”, разрадка міжнароднай напружанасці, “культ асобы Сталіна”, XX з’езд партыі; выбары ў ВС БССР.

**План лекцыі:** 1.Новая растаноўка палітычных сіл у Свеце пасля Другой Сусветнай вайны. Стварэнне сусветнай сістэмы сацыялізму, яе ідэалагічнае абгрунтаванне. “Халодная вайна”. Супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм. Палітыка разрадкі ў 1960-я – 1970-я гг., яе дасягненні і супярэчнасці.

2.Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі ваенна-тэрарыстычнымі арганізацыямі і групамі. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой паловы 1940-х – 1953 гг.

3.Асуджэнне культа асобы І. В. Сталіна.

***Новая растаноўка палітычных сіл у Свеце пасля Другой Сусветнай вайны. Стварэнне сусветнай сістэмы сацыялізму, яе ідэалагічнае абгрунтаванне. “Халодная вайна”. Супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм. Палітыка разрадкі ў 1960-я – 1970-я гг. яе дасягненні і супярэчнасці.*** Пасля другой сусветнай вайны ў міжнародных адносінах пачалі праяўляцца новыя тэндэнцыі. Германія і яе саюзнікі страцілі свае пазіцыі ў

сусветнай палітыцы. На роль сусветнага лідэра ўсё актыўней пачалі прэтэндаваць ЗША. За гады вайны ЗША сканцэнтравалі больш за тры чацвёртых залатога запасу свету і 60% сусветнай прамысловай прадукцыі. Іх людскія страты за гады вайны склалі толькі сотую частку ад страт, якія панёс Савецкі Саюз, затое валавы нацыянальны прадукт павялічыўся за гэты час у два разы. Авалодванне ядзернай зброяй дазваляла США дзейнічаць з пазіцыі сілы.

З другога боку, нягледзячы на вялікія страты ў вайне, другой звышдзяржавай станавіўся СССР. Яго аўтарытэт як пераможцы нацыстскай дзяржавы значна вырас у свеце. Савецкі Саюз меў самую магутную на той час армію. Ён таксама значна ўзмацніў свае пазіцыі ў Еўропе за лік утварэння шэрагу прасавецкіх краін. Пачалася барацьба за сусветнае лідэрства паміж гэтымі звышдзяржавамі.

На аснове Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін пачалася перабудова свету. Гэта адносілася як к зменам у геапалітычным уплыве розных краін ў цэлым, так і канкрэтна ў тэрытарыяльных зменах. Гэта закранула і Беларусь, дзе Беластоцкая вобласць і некалькі раёнаў Брэсцкай вобласці былі перададзены Польшчы.

Змянілася і палітычная сітуацыя. Да вайны толькі СССР прадстаўляў сацыялістычную краіну. Пасля вайны пры ваеннай, фінансавай, дыпламатычнай падтрымцы СССР на шлях сацыялізму сталі Албанія, Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Югаславія, ГДР – усяго 8 краін. Пазней на сацыялістычнымі пры падтрымцы СССР сталі Паўночная Карэя, Кітай, В’етнам. Усяго ў краінах прасавецкага блока пражывала трэцяя частка насельніцтва свету. Яны атрымалі назву “*сусветная сістэма сацыялізма*”. Еўрапейскія прасавецкія краіны для кардынацыі эканамічнай палітыкі стварылі ў 1949 г. Савет эканамічнай узаемадапамогі. У 1955 г. была створана ваенная арганизацыя – Арганізацыя Варшаўскага дагавора.

Ім супрацьстаялі заходнія капіталістычныя краіны на чале з ЗША. У 1949 г. яны аб’ядналіся ў ваенны саюз – Арганізацыю Паўночнаатлантычнага дагавора (НАТА). Пачалося военнае, эканамічнае, ідэалагічнае супрацьстаянне двух сістэм, якое атрымала назву *“халодная вайна”*. Пачатак яе быў пакладзены ў 1946 г., калі ў г. Фултане ў прыстутннасці прэзідэнта ЗША Г. Трумэна былы прэм’ер-міністр Англіі У. Чэрчыль адкрыта абвінавацій СССР у захопе і ізаляцыі Усходняй Еўропы і заклікаў да “крыжовага паходу” супраць СССР. Годам пазней, у сакавіку 1947 г. прэзідэнт ЗША Г. Трумэн сфармуліраваў праграму падтрымкі “свабодных народаў” і стрымлівання камунізма. Яна заключалася ў тым, што ЗША бралі на сябе права прама або косвенна ўмешвацца ва ўнутраныя справы дзяржаў, дзе яны бачылі пагрозу

камунізму. Пачалася гонка ўзбраенняў, паміж краінамі двух сістэм паўстала “жалезная заслона”. “Халодная вайна” ў 1950-1960 гг. не раз пагражала перайсці ў “гарачую” і свет балансаваў на грані новай вайны. Не трэба забываць, што ўжо ў снежні 1945 г. быў падрыхтаваны план Пентагона аб нанясенні ядзернага ўдара па тэрыторыі СССР. У адказ у 1949 г. СССР таксама выпрабаваў атамную бомбу і гэта стала моцным фактарам стрымлівання праціўніка.

На мяжы 1960-1970-х адбылося прыкметнае пацяпленне адносін паміж СССР і краінамі Захаду, пачалася *разрадка міжнароднай напружанасці*. У 1971 г. XXIV з'езд КПСС прапанаваў Праграму міру, разлічаную на змякчэнне ваеннага супрацьстаяння. Асабліва значны прагрэс быў дасягнуты ў вырашэнні германскай праблемы. З прыходам да ўлады сацыял-дэмакратаў на чале з канцлерам В. Брандтам ў 1970 г. ФРГ і СССР быў падпісаны дагавор аб прызнанні пасляваенных межаў у Еўропе. ФРГ прызнала заходнія межы Пельшчы, ўстанавіла дыпламатычныя адносіны з ГДР. У 1971 г. чатыры дзяржавы-пераможцы заключылі четырёхбаковае пагадненне па Берліне, у адпаведнасці з якім Заходні Берлін прызнаваўся асобнай дзяржавай, якая не з'яўляецца часткай ФРГ. Рашэнне германскай праблемы і дасягненне да канца 1960-х гг. ваенна-стратэгічнага парытэту заахвоціла СССР і ЗША сур'ёзна заняцца праблемай абмежавання гонкі стратэгічных узбраенняў. У 1972 г. падчас візіту прэзідэнта Р. Ніксана ў Маскву быў заключаны Дагавор аб абмежаванні стратэгічных ядзерных узбраенняў (ОСВ-1). У 1973 г. Л. Брэжнеў і Р. Ніксан падпісалі ў ЗША пагадненне аб прадухіленні ядзернай вайны.

Савецка-амерыканскія адносіны развіваліся не толькі ў сферы раззбраення. У 1972-1973 гг. былі падпісаны 23 пагадненні паміж СССР і ЗША па супрацоўніцтве ў розных галінах. Тавараразварот паміж двумя краінамі ў першай полове 1970-х гг. павялічыўся ў восем разоў. У 1975 г. быў падпісаны Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе ў Хельсінкі – вышэйшае дасягненне палітыкі разрадкі. Галоўным заваяваннем СССР з'явілася прызнанне непарушнасці пасляваенных межаў у Еўропе. Дзеля гэтага яго кіраўніцтва пагадзілася на абвяшчэнне свабоды слова, друку, перамяшчэння, абмену інфармацыяй і да т.п.

***Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі ваенна-тэрарыстычнымі арганізацыямі і групамі. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой паловы 1940-х – 1953 гг.*** У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе на тэрыторыі БССР дзейнічалі сапраўдныя бандыцкія фарміраванні. Пасля адступлення нямецкай арміі тут засталіся ваенныя фарміраванні Арміі Краёвай, украінскай паўстанцкай арміі, беларускіх

паліцаяў. Яны здзейснялі забойствы, грабяжы, разбоі, спрабавалі дэстабілізаваць сітуацыю пад час выбараў у Саветы. Асабліва актывізаваліся бынды пад час калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР. Так званыя "лясныя браты" грамілі сельсаветы, забівалі кіраўнікоў калгасаў. Але паступова бынды страчвалі сацыяльную базу сярод мясцовых жыхароў, бо яны эвалюцыяніравалі ад палітычных праціўнікаў улад у бок крымінальных арганізацый, да тагож у гэтых раёнах былі значна павялічаны міліцыйскія фарміраванні. Да сярэдзіны 1952 г. ў асноўным бандфарміраванні былі ліквідаваны.

У СССР пачаўся перыяд "закручвання гаек". У 1949 г. па так званай ленінградскай справе было асуджана шмат партыйных работнікаў. На Беларусі даваенныя і пасляваенныя рэпрэсіі звязаны з іменем наркома ўнутраных спраў БССР Цанавы (да лістапада 1951 г.). Ён быў ініцыятарам шэльмавання тысяч простых людзей і распачынальнікам працэсаў супраць кіруючых работнікаў рэспублікі, навуковых дзеячаў, культурных работнікаў. Так, ў 1951 г. па абвінавачванню ў шпіёнстве на карысць Югаславіі быў рэпрэсіраваны нарком адукацыі БССР, прыхільнік адукацыі на беларускай мове П.Саевіч. Цанава арганізаваў кампанію па шэльмаванню выдатнага беларускага навукоўца А.Р. Жэбрака, прэзідэнта АН БССР. Падставай была публікацыя ў амерыканскім часопісе "Навука" артыкула Жэбрака пра савецкую біялогію. К лістападзе 1947 г. А.Р. Жэбрак быў зняты з пасады прэзідэнта акадэміі, а ў верасні 1948 г. быў зачынены інстытут біялогіі пры акадэміі навук, які ўзначальваў навуковец.

У жніўні 1946 г. выйшла пастанова ЦК кампартыі аб часопісах "Звязда" і "Ленінград", з якой пачаліся чысткі ў асяроддзі культурных дзеячаў. Ужо ў студзені 1947 г. ЦК КП Беларусі прымае пастанову "Аб рабоце пісьменніцкіх арганізацый", дзе падвяргае рэзкай крытыцы беларускіх пісьменнікаў.

Адначасова з 1947 па 1951 г. было ажыццяўлена выданне збора твораў Сталіна на беларускай мове, вялізарным тыражом выйшла бяграфія правадыра, якую павінен быў ведаць кожны савецкі чалавек. У кастрычніку 1952 г. пасля перапынку ў 13 гадоў прайшоў XIX з’езд партыі, на якім яна атрымала новую назву – КПСС. Усхваленне асобы правадыра набыла на з’езде незвычайныя памеры.

Культ асобы правадыра садзейнічаў узмацненню ролі партыі як на ідэалагічным фронце, так і ў гаспадарчым будаўніцтве, і дзяржаўным жыцці. Саветы сталі фармальнымі ўстановамі, кандыдаты ў дэпутаты праходзілі абавязковае зацвярджанне ў партыйнага кіраўніцтва. У сакавіку 1947 г. адбыліся выбары ў ВС БССР, у студзені 1948 і снежні 1950 – у мясцовыя саветы, па традыцыі, на безальтэрнатыўнай аснове і са 100% яўкай. Аднак аднавілася дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі БССР ў лістападзе 1948 г. У прафсаюзы ўваходзіла 85% працоўных Беларусі, толькі калгаснікі не мелі права

ўступаць у прафсаюзы. Камсамол налічваў больш за 400 тыс. юнакоў і дзяўчат. Наяўнасць грамадскіх і палітычных арганізацый стваралі ў міжнароднай супольнасці бачнасць адностай дэмакратыі.

***Асуджэнне культа асобы І. В. Сталіна.*** Смерць Сталіна (у 1953 г.) мела пераломнае значэнне для ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства. У верасні 1953 г. першым сакратаром КПСС, а значыць і кіраўніком дзяржавы, быў абраны Мікіта Хрушчоў. Пачаўся перыяд адноснай дэмакратызацыі. Пашыраліся правы Саветаў – у жніўні 1955 г. Савет Міністраў БССР перадаў Саветам права выдаткоўваць фінансавыя сродкі на будаўніцтва і сацыяльна-культурную і бытавую сферы. Пераадольвалася рэпрэсіўнае мінулае. У верасні 1953 г. былі ліквідаваны Асобыя нарады пры Міністэрстве ўнутраных спраў. А на *XX з'ездзе КПСС* у 1956 г. быў асуджаны культ асобы. Пачалася рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій.

Перыяд 1956-1961 гг. характарызаваўся ўсеагульным пазбаўленнем ад спадчыны культу асобы, сімвалічнай кропкай завяршэння дадзенага працэсу стаў вынас цела Сталіна з Маўзалею і яго пахаванне каля Крамлёўскай сцяны ў ноч на 31 кастрычніка 1961 г.

Аналагічныя па характары, але меншыя па маштабе з'явыназіраліся і ў дачыненні да іншых дзяржаўных кіраўнікоў гэтага перыяду (М. І. Калініна, В. М. Молатава, А. А. Жданава, Л. П. Берыя і інш.). Супастаўным з культам І. В. Сталіна быў толькі культ В. І. Леніна.

Выраз “культ асобы Сталіна” атрымала шырокае распаўсюджванне пасля з'яўлення ў 1956 г. ў дакладзе М. С. Хрушчова “Аб кульце асобы і яго выніках” і ў пастанове ЦК КПСС “Аб пераадоленні культу асобы і яго наступстваў”.

## Тэма 11. Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве

*Ключавыя паняцці:* незалежнасць Беларусі, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г., Дамова аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі, рэферэндум 14 мая 1995 г., Канстытуцыйная рэформа 1996 г., Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь.

**План лекцыі:** 1.Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

2.Беларускі парламентарызм ва ўмовах шматпартыйнасці. Савет Міністраў у сістэме дзяржаўнай улады. Фарміраванне незалежнай судовай улады.

***Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.*** Пасля распаду СССР перад Рэспублікай Беларусь паўстала задача пабудовы незалежнай дэмакратычнай дзяржавы. 27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя Вярхоўнага Савета "Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь". Дэкларацыя абвясціла "поўны дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах".

У далейшым, 25 жніўня 1991 г., Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце спецыяльным законам быў нададзены статус канстытуцыйнага закона, на падставе якога былі ўнесеныя змены і дапаўненні ў Канстытуцыю 1978 г.

У верасні 1991 г. пачалося стварэнне беларускай арміі, у 1992 г. было заснавана міністэрства абароны, абвешчана абаронная дактрына Беларусі, згодна з якой Беларусь абвяшчалася безядзернай краінай.

У 1992 г. былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны з ЗША, Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Японіяй, Ізраілем, Польшчай і іншымі краінамі, нармалізаваны адносіны з беларускай дыяспарай, падпісаны найважнейшыя міжнародныя дамовы, якія гарантавалі далейшае развіццё Беларусі як мірнай дэмакратычнай дзяржавы. У 1993 г. адбыўся з'езд беларусаў свету.

Абвяшчэнне *незалежнасці Беларусі* спрыяла далейшаму развіццю дэмакратычных адносін. Хутка развівалася незалежная прыватная прэса. Быў спрошчаны выезд грамадзян за мяжу. Ужо ў першыя гады незалежнасці было зарэгістравана 29 палітычных партый і 7 грамадска-палітычных рухаў, якія з'явіліся пасля прыняцця закона "Аб грамадскіх арганізацыях". У 1994 г. парламент прыняў закон аб палітычных партыях, які гарантаваў грамадзянам нашай краіны права свабоды палітычных поглядаў і актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці.

Важнай падзеяй стала распрацоўка асноўнага закона Рэспублікі Беларусь – Канстытуцыі. Канстытуцыйная камісія працавала да 1994 года. 15 сакавіка Вярхоўны Савет прыняў Канстытуцыю Рэспублики Беларусь, згодна з якой у краіне ўводзіўся пост Прэзідэнта. У гэтых умовах у чэрвені 1994 г. адбыліся выбары прэзідэнта Беларусі. На выбарах у другім туры перамог Аляксандр Лукашэнка, праграма якога прадугледжвала правядзенне радыкальных эканамічных рэформ, пабудову справядлівага грамадства і барацьбу з карупцыяй і цеснае эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй. Рэалізацыя праграмы цеснага супрацоўніцтва з Расіяй прывяла да падпісання 2 красавіка 1996 г. *Дамовы аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі.* Расія адкрыла для Беларусі свае рынкі і стала пастаўляць сыравіну і энергію па льготных цэнах. Беларусі былі

спісаны даўгі больш чым на мільярд даляраў за папярэднія пастаўкі энергарэсурсаў.

*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г.* ўяўляла сабой варыянт прэзідэнцкай рэспублікі пры дамінуючай ролі парламента. Гэта не адпавядала палітычнай сітуацыі ў краіне, калі большасць насельніцтва выказвала давер прэзідэнту. Ступень даверу да калектыўнага прадстаўнічага органа была значна ніжэй. У выніку ў 1995-1996 гг. адбыўся шэраг сутыкненняў паміж выканаўчай і заканадаўчай галінамі ўлады, якія заканчваліся нязменна на карысць прэзідэнта.

На *рэферэндуме 14 мая 1995 г.* большасць грамадзян выказалася за змяненне сімволікі дзяржавы згодна з прапанаваным прэзідэнтам праектам. Тады ж было вырашана пытанне аб наданні рускай мове роўных правоў з беларускай, паскорылася інтэграцыя з Расіяй і былі ўнесены некаторыя змяненні ў Канстытуцыю, згодна з якімі Прэзідэнт атрымаў права распусціць Вярхоўны Савет, калі апошні груба парушае асноўны закон краіны. Адначасова з рэферэндумам былі праведзены выбары ў Вярхоўны Савет новага сазыва.

У лістападзе 1996 г. па ініцыятыве Прэзідэнта А.Р. Лукашэнкі быў праведзены другі рэспубліканскі рэферэндум па выніках якога народам быў адобраны прапанаваны кіраўніком дзяржавы варыянт змяненняў у Канстытуцыі. Улада прэзідэнта была значна пашырана. Замест Вярхоўнага Савета ўводзіўся новы двухпалатны парламент. Дата нацыянальнага свята пераносілася з 27 ліпеня на 3 ліпеня – дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Народ не абодрыў свабодную, без абмежаванняў, куплю-продаж зямлі і адмену смяротнага пакарання.

***Беларускі парламентарызм ва ўмовах шматпартыйнасці. Савет Міністраў у сістэме дзяржаўнай улады. Фарміраванне незалежнай судовай улады.*** *Канстытуцыйная рэформа 1996 г.* была накіравана на ўсталяванне збалансаваных паўнамоцтваў галін улады, ускладанне на Прэзідэнта функцый кіраўніка дзяржавы – гаранта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, за ўвод двухпалатнага Парламента, за павышэнне ролі Урада – Савета міністраў у сістэме галін улады і ўзмацненне яго адказнасці за стан і развіццё эканомікі, сацыяльна-культурнай і адміністрацыйна-палітычнай сфер дзейнасці.

У выніку ўнясення ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь змяненняў і дапаўненняў заканадаўчая ўлада больш не знаходзілася ў прывілеяваным становішчы. Парламент набыў больш уласцівую яму назву, якая азначала канчатковую адмову ад савецкай мадэлі вышэйшага органа дзяржаўнай улады, і больш дасканалую структуру, якая адпавядае ўстаяўшымся стандартам парламентарызму.

Прадстаўнічы і заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь па Канстытуцыі ў рэдакцыі 1996 г. называецца – *Нацыянальны схода Рэспублікі Беларусь.* Ён складаецца з двух палат – Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. У Канстытуцыі замацаваны прынцып самаарганізацыі палат Нацыянальнага сходу. Кожная палата самастойна ўсталёўвае свой парадак працы. Палаты Нацыянальнага сходу засядаюць паасобна, за выключэннем устаноўленых выпадкаў правядзення сумесных пасяджэнняў. Палата прадстаўнікоў прадстаўляе інтарэсы ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь. Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва і ажыццяўляе нароўні з заканадаўчай функцыяй шэраг іншых паўнамоцтваў. Дзейнасць Савета Рэспублікі накіравана на забеспячэнне прыняцця больш якасных, старанна прапрацаваных законаў.

Прыняцце Канстытуцыі ў рэдакцыі 1996 г. стварыла прававую аснову для дынамічнага развіцця грамадства і дзяржавы, эфектыўнай працы кожнай з галін улады (заканадаўчай, выканаўчай і судовай). Сёння можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што Парламент Рэспублікі Беларусь сфармаваўся як моцны заканадаўчы і прадстаўнічы орган, які заняў належнае месца ў канстытуцыйным механізме нашай дзяржавы.

*Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь* (Урад Рэспублікі Беларусь) з'яўляецца калегіяльным цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь, які ажыццяўляе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь і кіраўніцтва сістэмай падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

